РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

7 КАСТРЫЧНІКА 2025 г. АЎТОРАК № 193 (30581)



Фота БелТА.

# МІНСК – МАСКАТ: ПРЫКЛАД ПЛЁННАГА ДЫЯЛОГУ



КОШТ СЕКУНДЫ – ЦЭЛАЕ ЖЫЦЦЁ

13



ВУЧОБА ДЛЯ ПРАФЕСІЯНАЛАЎ

16

**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

ISSN 1990 — 763X

## ХЛЕБАРОБАМ – ПАВАГА І ПАШАНА

**Абласныя «Дажынкі-2025» прайшлі на Брэстчыне, Віцебшчыне і Магілёўшчыне**

Беларусь завяршае сельскагаспадарчы сезон з годнымі вынікамі. Свята збору ўраджаю даўно ў нашай краіне стала традыцыяй. Першы рэспубліканскі фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі «Дажынкі» прайшоў у Століне ў 1996 годзе. Тады ў горадзе з'явілася вуліца Дажынкачная ў гонар механізатараў, камбайнераў, работнікаў зернятокаў і іншых аграрыяў, якія падчас жніва праявілі сябе лепш за ўсіх. Ідэя адрадзіць старадаўні абрад, зрабіць больш паважанай і шанаванай працу хлебароба належыць Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку.

СТАР. 8-9



# ДЫЯЛОГУ БЕЛАРУСІ І АМАНА САПРАЎДНАГА, РАЎНАПРАЎНАГА, СУПРАЦОЎНІЦТВА ДЗВЮХ



«Далейшае паглыбленне беларуска-аманскіх адносін можа стаць новым пунктам росту для абедзвюх эканомік і стымулам для развіцця чалавечага капіталу. Пра гэта сведчаць цяперашні ўзровень палітычных кантактаў і створаны намі зачын. Але ёсць і каласальны нерэалізаваны патэнцыял. Гандлёва-эканамічныя адносіны з'яўляюцца тым моцным фундаментам, на якім можна ўзвесці будынак двухбаковага супрацоўніцтва любой вышыні», — гаворыцца ў артыкуле Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, апублікаваным на партале Omandaily ў снежні мінулага года да візіту беларускага лідара ў Аман. Тады перагаворы на найвышэйшым узроўні і дасягнутыя дамоўленасці вывелі беларуска-аманскія адносіны на новы якасны ўзровень. Прычым па розных кірунках, уключаючы чыстую энергію, адукацыю, ахову здароўя, тэхналогіі, транспарт і лагістыку.

## Бакі падпісалі пакет міжнародных дакументаў:

— Дарожную карту па развіцці двухбаковага супрацоўніцтва паміж Рэспублікай Беларусь і Султанатам Аман на 2026—2027 гады;

— Пагадненне паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Султаната Аман аб узаемнай адмене віз;

— Мемарандум аб узаемаразуменні паміж Вярхоўным судом Рэспублікі Беларусь і Вярхоўным судом Султаната Аман;

— Пагадненне паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Султаната Аман аб міжнародных аўтамабільных перавозках;

— Мемарандум аб узаемаразуменні паміж Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтрам анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава і Нацыянальным анкалагічным цэнтрам Амана пры Універсітэце Султана Кабуса ў галіне абмену навуковым, медыцынскім і даследчыцкім вопытам;

— Мемарандум аб узаемаразуменні паміж Міністэрствам сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам сельскай гаспадаркі, рыбалоўства і водных рэсурсаў Султаната Аман у галіне сельскай гаспадаркі, жывёлагадоўлі, рыбалоўства і харчавання;

— Мемарандум аб супрацоўніцтве ў адносінах будаўніцтва цэлюлозна-кардоннага камбіната ў Рэспубліцы Беларусь.

Аман для нашай краіны — партнёр не новы, трывалы і надзейны. Гэта пацвярджаюць і лічбы: па выніках 2024 года ўзаемны тавараабарот склаў 8,44 мільёна долараў. І патэнцыял для яго павелічэння невычарпальны. Гэта засведчыў і афіцыйны візіт у нашу краіну Султана Амана Хайсама бен Тарэка Аль Саіда. Ключавая падзея ў графіку Султана на 6-7 кастрычніка — перагаворы з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам. На парадку дня — ход рэалізацыі дасягнутых дамоўленасцяў, перспектыўныя кірункі і шляхі пашырэння супрацоўніцтва ў розных сферах — усё ў імя ўдасканалення гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва.

Пышны цырыманіял — справа ўсходняя, але і ў нас гасцей вітаюць прыгожа і цёпла. Аляксандр Лукашэнка асабіста сустрэў Хайсама бен Тарэка Аль Саіда ў Палацы Незалежнасці. Урачыстая цырымонія ў такіх выпадках праходзіць з удзелам роты ганаровай варты, выкананнем дзяржаўных гімнаў дзвюх краін. У пратаколе была і цырымонія фатаграфавання лідараў. Але ў палітыцы галоўнае не пратакол, а справы. Таму адразу пасля ўрачыстага цырыманіялу — перагаворы.

Спачатку — у вузкім складзе.

## МЫ ПОЎНЫЯ ЖАДАННЯ ЗРАБІЦЬ УСЁ, КАБ ПАМІЖ НАШЫМІ КРАІНАМІ БЫЛІ ЛЕПШЫЯ АДНОСІНЫ

«Хачу афіцыйна заявіць, што вы чалавек слова: паабяцалі прыехаць у Мінск — прыехалі», — вітаў госця Аляксандр Лукашэнка. Ён звярнуў увагу на тое, што ў СМІ гэты візіт назвалі гістарычным. «Я гэты пункт гледжання падзяляю, — заявіў Прэзідэнт. — Я хачу, каб вы разумелі: мы поўныя жадання зрабіць усё, каб паміж нашымі дзяржавамі былі лепшыя адносіны».

Беларускі лідар адзначыў, што паміж краінамі ўжо напрацаваны не проста намеры, а кантракты. І запэўніў, што з нашага боку ёсць поўная гатоўнасць абмяркоўваць іх рэалізацыю.

«Наколькі я разумею, дарожная карта, план нашых сумесных мерапрыемстваў гатовая. Для нас работа адна — узгадніць гэты план сумесных дзеянняў. І, вядома, пракантраляваць, каб ён быў рэалізаваны», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, у рэгіёне Паўднёва-Заходняй Азіі для нас няма краіны бліжэйшай, чым Аман. «Таму мы гатовыя з вамі па ўсіх напрамках мець адносіны, і хачу вас запэўніць: калі мы дамовімся па нейкім пытанні, мы абавязкова выканаем гэта», — запэўніў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз падзякаваў Султану Амана за гэты візіт. Асобныя словы падзякі выказаў членам дэлегацыі, міністру замежных спраў Амана за падрыхтоўку візіту. «Хачу вас запэўніць: вы не пашкадуеце, што прыехалі ў Беларусь, — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка. — І буду чакаць вас зімой».

У сваю чаргу Хайсам бэн Тарэк Аль Саід падзякаваў беларускаму лідару за гасцінны прыём. «Мы рады сёння быць з вамі ў горадзе Мінску. Вы наведвалі Аман ужо неаднойчы. Сёння мы знаходзімся ў вашай краіне для таго, каб прасачыць за ходам рэалізацыі таго, пра што мы дамовіліся раней. З моманту вашага візіту ў Аман ужо шмат чаго мы здолелі дасягнуць. У той жа час застаецца нямала нерэалізаванага

# НАКАНАВАНА СТАЦЬ ПРЫКЛАДАМ ДАВЕРЛІВАГА І ЎЗАЕМАВЫГАДНАГА ДРУЖАЛЮБНЫХ КРАІН

патэнцыялу, і з вашай дапамогай пры ўзаемадзеянні дзвюх краін мы зможам гэты патэнцыял рэалізаваць», — адзначыў Султан Амана. Ён падкрэсліў, што Прэзідэнта Беларусі заўсёды чакаюць у Амане.

## «ІНТЭНСІЎНЫЯ КАНТАКТЫ ДАЗВОЛІЛІ СФАРМІРАВАЦЬ СУР'ЁЗНЫ ПУЛ ДАДАТКОВЫХ ПРАЕКТАЎ»

На перагаворах у пашыраным складзе Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў снежні мінулага года ў Маскаце лідары дамовіліся разам адкрыць новую главу ў двухбаковых адносінах і пачаць адлік іх новага этапу з першага афіцыйнага візіту ў Мінск Султана Амана Хайсама бен Тарэка Аль Саіда.

«Напярэдадні гэтай падзеі выканана вялікая работа, — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы. — Падрыхтавана паўнавартасная дарожная карта — план нашага супрацоўніцтва, — насычаная канкрэтнымі задачамі ў сферах харчовай бяспекі, прамысловасці, турызму, транспарту і лагістыкі, інвестыцый».

Стабільнасць узаемадзеянню і ўпэўненасць у дасягненні пастаўленых мэт, па словах Прэзідэнта, надало заснаванне Сумеснага камітэта па супрацоўніцтве і інвестыцыях. «Яго высокім куратарам з аманскага боку выступае Наследны прынц — міністр культуры, моладзі і спорту, — удакладніў Аляксандр Лукашэнка. — Пры яго асабістым удзеле, прытрымліваючыся нашых з вамі ўстановак, урады і дзелавыя колы сур'ёзна прасунуліся па шэрагу напрамкаў».

Кіраўнік дзяржавы канкрэтызаваў, што дзякуючы сумесна прынятым рашэнням аб аблягчэнні візавых патрабаванняў і запуску прамых авіязносін з лютага 2025 года ўжо звыш 1700 беларусаў наведалі Аман. «Разлічваем на сустрэчны паток аманскіх гасцей», — дадаў Прэзідэнт.

Па яго словах, візіт міністра аховы здароўя Амана ў Беларусь паказаў, што ёсць перспектывы ў медыцынскага турызму — так, як і ў адукацыйных, культурных абменаў.

«Падпісанне пагаднення аб бязвізавым рэжыме паездак па звычайных пашпартах зробіць нашы краіны яшчэ бліжэйшымі адна да адной і дапаможа рэалізацыі нашых сумесных праектаў», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што на сустрэчы ў вузкім складзе лідары ўжо закранулі пытанні актывізацыі двухбаковых кантактаў з акцэнтам на эканоміку і інвестыцыі.

«У Маскаце мы з вамі гаварылі аб тым, што для пачатку трэба запусціць два-тры сумесныя праекты і рухацца наперад, — нагадаў ён. — Можна сказаць, што гэта задача нашым бізнесам выконваецца. Сваімі праектамі ў Амане мы ўмацоўваем харчовую бяспеку не толькі Амана, але і ўсяго вашага рэгіёна. Аманскія ж інвестыцыі ў сферы дрэваперапрацоўкі дапамогуць больш эфектыўна выкарыстоўваць прыродныя багацці Беларусі. Больш за тое, інтэнсіўныя кантакты дазволілі сфарміраваць сур'ёзны пул дадатковых праектаў».

Аляксандр Лукашэнка выказаў удзячнасць аманскаму боку за цікавасць да арганізацыі зборачных вытворчасцяў, сумесных вытворчасцяў і продажаў тэхнікі МАЗ і «Амкадор». Прэзідэнт акцэнтаваў увагу на тым, што беларускія прадпрыемствы гатовы пераводзіць супрацоўніцтва з выбраным аманскім бокам партнёрам у практычную плоскасць.

«У выніку разлічваем выйсці на стварэнне ў Амане добрага і доўгатэрміновага апорнага пункта — хаба па прасоўванні беларускай прадукцыі ў рэгіёне Персідскага заліва і Усходняй Афрыкі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

## «УСЕ ПРАЕКТЫ І КАНТРАКТЫ, ЯКІЯ МЫ ПАДПІСАЛІ І ЯШЧЭ ПАДПІШАМ, БУДУЦЬ РЭАЛІЗАВАНЫЯ Ў ТЭРМІН»

Аляксандр Лукашэнка праінфармаваў аб перспектывах узаемадзеяння ў галіне фармацэўтыкі. Заключаны першыя кантракты на пастаўку ў Аман беларускіх лекаў, якія ў дадзены момант праходзяць сертыфікацыю.

«Мы адкрытыя для любых ініцыятыў аманскага боку і былі б рады ўнесці свой уклад у рэалізацыю вашага амбіцыйнага стратэгічнага плана развіцця краіны — «Бачанне Амана 2040», — адзначыў беларускі лідар.

У якасці агульнай задачы кіраўнік дзяржавы прапанаваў не зніжаць набранага тэмпу і дынаміку ўзаемадзеяння, умацоўваючы дасягнуты высокі ўзровень даверу паміж абедзвюма краінамі. «Для гэтага, акрамя эканомікі, у нашым распараджэнні ёсць такія цудоўныя інструменты, як супрацоўніцтва ў сферы спорту і культуры», — канкрэтызаваў ён.

Аляксандр Лукашэнка праінфармаваў аманскіх гасцей, што, абапіраючыся на найлепшы міжнародны вопыт, у нашай краіне ўзводзяць новы Нацыянальны музей гісторыі Беларусі. «Былі б удзячныя за парады самага, можна сказаць, беларускага аманца — Генеральнага сакратара Нацыянальнага музея Амана», — удакладніў Прэзідэнт. (Генеральны сакратар музея Жамаль аль-Мусаві валодае рускай мовай, яго маці — ураджэнка Беларусі. У ходзе візіту Прэзідэнта Беларусі ў Аман у снежні 2024 года ён правёў для Аляксандра Лукашэнкі экскурсію па Нацыянальным музеі Амана і заявіў аб гатоўнасці падзяліцца вопытам пры будаўніцтве музея ў Мінску.)

Па словах кіраўніка дзяржавы, для таго, каб сумесныя праекты прасоўваліся, вельмі важныя ўзаемныя сустрэчы і візіты. «Так, як вы робіце гэта сёння, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Калі мы падтрымаем такі высокі ўзровень нашых адносін, я перакананы, што ўсе праекты і кантракты, якія мы падпісалі і яшчэ падпішам, будуць рэалізаваны ў тэрмін».

Звяртаючыся да Султана Амана і членаў аманскай дэлегацыі, Прэзідэнт падкрэсліў, што дыялогу Беларусі і Амана наканавана стаць прыкладам сапраўднага, раўнапраўнага, даверлівага і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва дзвюх дружалюбных краін. Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што сённяшні асабісты кантакт будзе садзейнічаць далейшым прадукцыйным адносінам.

«Мы да гэтага гатовы, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Яшчэ раз запэўніваю вас: усе нашы дамоўленасці з беларускага боку будуць выконвацца няўхільна і ў тэрмін, бо Аман для нас — вельмі цікавая краіна. Мы адкажам узаемнасцю».

## «ІМКНЁМСЯ ШМАТ ПРАЦАВАЦЬ, КАБ НАШЫ АДНОСІНЫ Ў ЭКАНАМІЧНЫМ ПЛАНЕ БЫЛІ НА ЎЗДЫМЕ»

Султан Амана Хайсам бен Тарэк Аль Саід выказаў удзячнасць беларускаму боку за цёплы прыём і гасціннасць, а таксама адзначыў, што яму радасна знаходзіцца ў Беларусі. «Мы задаволены плённым дыялогам і нашымі перагаворамі, — канкрэтызаваў ён. — Мы заўсёды ўдзялялі ўвагу супрацоўніцтву з вашай краінай. Пасля вашага візіту ў Аман было дасягнута шмат дамоўленасцяў. У нас шмат планаў супрацоўніцтва. Сённяшні візіт з'яўляецца працягам нашага дыялогу. Мы пацвярджаем, што падтрымліваем развіццё нашых адносін».

Султан Амана даў высокую ацэнку стварэнню Сумеснага камітэта па супрацоўніцтве і інвестыцыях. «Мы лічым, што гэта добры пачатак нашага супрацоўніцтва, дасягнення ўсіх нашых дамоўленасцяў і жаданняў нашых народаў, — падкрэсліў Хайсам бен Тарэк Аль Саід. — Мы заклікаем усе органы дзвюх краін, асабліва грамадскія і прыватныя сектары эканомікі, працаваць разам. Асабліва ў галіне інвестыцый. Мы імкнёмся шмат працаваць, каб нашы адносіны ў эканамічным плане былі на ўздыме».

**Вераніка КАНЮТА, Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА.**

## Прынята сумесная заява з нагоды афіцыйнага візіту Султана Амана Хайсама бен Тарэка Аль Саіда ў Рэспубліку Беларусь

У атмасферы даверу, дружбы і ўзаемаразумення бакі выказалі рашучасць сумесна працаваць над умацаваннем і развіццём беларуска-аманскага супрацоўніцтва, абмяняліся думкамі па шэрагу міжнародных і рэгіянальных пытанняў, якія маюць узаемную цікавасць.

Лідары абмеркавалі ход рэалізацыі дамоўленасцяў, дасягнутых у ходзе праведзеных у 2024 — 2025 гадах узаемных візітаў на найвышэйшым і высокім узроўнях у сферах харчовай бяспекі, сельскай гаспадаркі, прамысловасці, лагістыкі, аховы здароўя, турызму і культуры.

Кіраўнікі дзяржаў станоўча ацанілі работу бакоў па павелічэнні аб'ёмаў двухбаковага гандлю, пашырэнні паставак беларускіх прадуктаў харчавання, прамысловага абсталявання, фармацэўтычнай прадукцыі, ветэрынарных прэпаратаў і іншых тавараў у Султанат Аман, а таксама аманскай прадукцыі, цікавай для Беларусі.

Лідары віталі ўзаемныя намаганні па рэалізацыі сумесных праектаў у галіне дзіцячага харчавання і малочнай прадукцыі, а таксама зборкі тэхнікі ў Амане.

Кіраўнікі дзяржаў сышліся на думцы, што сумесныя праекты прамысловай кааперацыі, якія знаходзяцца ў стадыі распрацоўкі, спрыяльна паўплываюць на развіццё двухбаковых эканамічных адносін з улікам лагістычнага патэнцыялу Амана і перавагі яго мадэрнізаванай інфраструктуры.

Лідары пацвердзілі гатоўнасць да пашырэння інвестыцыйнага супрацоўніцтва ў галіне сельскай гаспадаркі, IT-сектара, мэблевай і цэлюлозна-папяровай прамысловасці.

Кіраўнікі дзяржаў з задавальненнем адзначылі падпісанне ў маі 2025 года Пагаднення аб стварэнні Сумеснага камітэта па супрацоўніцтве і інвестыцыях. Яны выказалі зацікаўленасць у запуску яго работы ў бліжэйшы час для каардынацыі сумесных дзеянняў беларускіх і аманскіх структур па рэалізацыі двухбаковых дамоўленасцяў.

Лідары падкрэслілі важнасць праграмы прамых чартарных рэйсаў па маршруце Мінск — Салала — Мінск, якая была запушчана ў лютым 2025 года, і выказалі рашучасць абедзвюх краін працаваць разам дзеля павелічэння ўзаемнага патоку турыстаў.

Кіраўнікі дзяржаў акцэнтавалі ўвагу на развіцці супрацоўніцтва ў сферы адукацыі і культуры, накіраванага на паглыбленне двухбаковых сувязяў і збліжэнне народаў дзвюх дзяржаў.

Падкрэслена значнасць устанаўлення і развіцця прамых кантактаў паміж дзелавымі коламі, узаемнага ўдзелу ў выставах і кірмашах, правядзення нацыянальных выставак у Рэспубліцы Беларусь і Султанаце Аман, чалавечага і культурнага абмену. У сувязі з гэтым яны віталі падпісанне Пагаднення аб узаемнай адмене віз.

Кіраўнікі дзяржаў адзначылі важнасць стварэння трывалай дагаворна-прававой базы для далейшага развіцця беларуска-аманскіх адносін ва ўсіх сферах, а таксама прывіталі падпісанне двухбаковых дакументаў у рамках візіту.

Ёсць дамоўленасць, што ўрады краін, упаўнаважаныя галіновыя міністэрствы і арганізацыі будуць распрацоўваць і рэалізоўваць неабходныя праграмы, планы практычных дзеянняў у адпаведнасці з мэтамі і прынцыпамі гэтай сумеснай заявы.

Кіраўнікі дзяржаў пацвердзілі агульнасць падыходаў да ключавых глабальных і рэгіянальных праблем, падкрэсліўшы неабходнасць прытрымлівацца Статута ААН і нормаў міжнароднага права, выказалі гатоўнасць да цеснага супрацоўніцтва ў рамках міжнародных арганізацый і сумесных намаганняў па фарміраванні шматпалярнага, справядлівага і раўнапраўнага міжнароднага палітычнага і эканамічнага парадку. Яны таксама асудзілі прымяненне аднабаковых прымусовых мер і санкцый.

Султан Амана выказаў удзячнасць за цёплы прыём, гасціннасць і запрасіў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь наведаць Аман з візітам.

# «ТРЭБА ПАЛЕССЕ Ў ПРЫТОМНАСЦЬ

## Кіраўнік дзяржавы праверыў рэалізацыю праекта, які пачынаецца

**Работа Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі працягваецца нават у выхадныя. У суботу кіраўнік дзяржавы наведаў малочнатаварны комплекс «Ляскавічы» ААТ «Агра-Ляскавічы» ў Петрыкаўскім раёне. Сёлета ў маі Прэзідэнт ужо быў у гэтай гаспадарцы, і тады яму дакладвалі аб планах па будаўніцтве новага малочнатаварнага комплексу. Кіраўнік дзяржавы даручыў паскорыцца з рэалізацыяй праекта. Гэта пытанне Аляксандр Лукашэнка трымае на асабістым кантролі, рэгулярна заслухоўвае даклады адказных асоб, уключаючы кіраўніка спраў Прэзідэнта Юрыя Назарава.**



### «МЫ ПАВІННЫ ДАКЛАДНА РАЗУМЕЦЬ, КОЛЬКІ ГЭТА КАШТУЕ»

Падчас суботняй паездкі ў «Агра-Ляскавічы» Аляксандр Лукашэнка асабіста праінспектаваў будаўніцтва комплексу — яго асаблівасць у тым, што будынкі ўзводзяцца з мясцовай драўніны. Першае, што спытаў Аляксандр Лукашэнка, — ці ёсць прэтэнзіі да будаўнікоў. Як далажыў кіраўнік спраў Прэзідэнта Юрый Назараў, усё ідзе ў адпаведнасці з графікам. «Я шукаю самы танны праект, які будзе больш з уласных матэрыялаў», — растлумачыў кіраўнік дзяржавы прычыну сваёй увагі. Ён заўважыў, што пасля буралому ў лесе застаецца гніць шмат сыравіны, якую можна выкарыстоўваць, напрыклад, для будаўніцтва кароўнікаў. «Таму дадзена даручэнне пракантраляваць, колькі гэта будзе каштаваць — драўляная канструкцыя. І калі яе па тэхналогіі апрацаваць, колькі яна будзе стаяць», — сказаў Прэзідэнт. Па яго меркаванні, калі выканаць усе тэхналогіі, то такая канструкцыя з дрэва можа і 50 гадоў прастаяць. Юрый Назараў далажыў, што ўсе драўляныя канструкцыі апрацаваныя на заводзе антысептыкамі і сродкамі вогнеаховы. Выкарыстаны клееныя брус, які хоць і крыху даражэйшы, чым звычайны, але больш надзейны ў эксплуатацыі. «Ты павінен мне палічыць усё, пачынаючы з пілавання, лесанарыхтоўкі. Нам трэба дакладна разумець, колькі гэта каштуе», — яшчэ раз падкрэсліў Прэзідэнт. Ён удакладніў: калі такі эксперымент сябе апраўдае, калі гэта будзе прымальны варыянт, ён будзе тыражавацца па ўсёй краіне, таму праект не павінен быць занадта дарагім.

> **«Людзі павінны атрымліваць нармальны заробак, але кошт не павінен быць завоблачны. Для нас гэта важна. Гэта доследнае будаўніцтва, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Базу створым і паволі будзем падключаць землі».**

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што сельскагаспадарчы холдынг у Кіраўніцтве справамі Прэзідэнта працуе не толькі дзеля надояў і ўраджаяў. «Адсюль павінны ісці новыя і найноўшыя тэхналогіі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Што датычыцца непасрэдна «Агра-Ляскавічы», лідар краіны звярнуў увагу, што гэта гаспадарка працуе на Жыткавіцкі і Петрыкаўскі раёны, і тут ствараецца база, якая будзе прымяняцца па ўсім Палессі.

### КУЛЬТУРА І АДКАЗНАСЦЬ

«Агра-Ляскавічы» актыўна пераймае перадавы вопыт гаспадаркі «Парахонскае» Пінскага раёна, якая з'яўляецца своеасаблівым маяком як у будаўніцтве, так і ва ўтрыманні жывёл, у раслінаводстве. «Парахонскае» — гэта яшчэ і ўзор па выніку. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што з «Парахонскага» трэба ўзяць прыклад і ў дысцыпліне, якая вышэй за ўсё. «Мы тэхналогіі асвоілі, мы ўсё ведаем. Мы можам значна дадаць, калі дысцыпліна будзе, як там (у Парахонскім. — **«Зв.»**)», — заявіў беларускі лідар.

Прэзідэнт звярнуў увагу і на культуру земляробства — пытанне актуальнае для ўсіх аграрыяў.

> **«Поле трэба разараць ад канала да канала, ад лесу да дарогі. Нідзе не павінна быць ніводнага кавалачка пустога. Гэта культура земляробства», — нагадаў ён вялікую ісціну.**

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што і цяпер на Палессі можна ўбачыць незараныя палі, якія ў свой час з цяжкасцю адваёўвалі ў прыроды шляхам меліярацыі. Ён падкрэсліў, што галоўнае для аграрыяў — культура земляробства і адказнасць за ўзараннасць. Аляксандр Лукашэнка таксама заклікаў з розумам падыходзіць да нарыхтоўкі кармоў, сеяць тыя травы, якія можна вырасціць на той ці іншай тэрыторыі.

### ГЭТЫ ВОПЫТ МЫ БУДЗЕМ ТЫРАЖАВАЦЬ ПА КРАІНЕ

Кіраўнік дзяржавы ўважліва агледзеў будоўлю, падрабязна распытаў аб тэхналогіях. «Прыгажосць! Я думаю, ты тут зробіш узор», — падзяліўся ўражаннямі ён.

Плануецца, што на новым малочнатаварным комплексе значна павялічыцца дойны статак і будуць створаны ўсе неабходныя ўмовы для эфектыўнага ўтрымання жывёл. Як расказаў дырэктар ААТ «Агра-Ляскавічы» Юрый Кастранкоў, тут будзе рэалізаваны поўны цыкл вытворчасці. Прэзідэнт пацікавіўся меркаваннем дырэктара ААТ «Парахонскае» Уладзіміра Храленкі, ці мае тэхналогія, па якой будуецца комплекс, права на жыццё. Спецыяліст адказаў сцвярджальна, патлумачыўшы, што карове патрэбны кармы, паветра і вада. У новым комплексе ўсе тэхналогіі, каб забяспечыць карове камфортнае жыццё, уведзены. Дарэчы, пасля будаўніцтва новага комплексу існуючыя кароўнікі захаваюцца, адрамантуюцца і будуць выкарыстоўвацца для патрэб гаспадаркі. На гэта звярнуў увагу і кіраўнік дзяржавы, падкрэсліўшы, што не раіць зносіць старыя будынкі.



# ПРЫВОДЗІЦЬ І ВЯРТАЦЬ»

## ў Петрыкаўскім раёне і будзе распаўсюджаны па ўсёй краіне

Для таго каб паскорыць будаўніцтва, былі прыцягнутыя спецыялісты з Нацыянальнага парку «Прыпяцкі». Прэзідэнт такі падыход ацаніў і прапанаваў таксама прыцягваць да працы людзей, якія прыязджаюць з іншых краін. Будаўнікі не пярэчаць, тым больш што ў «Агра-Ляскавічы» ўжо працуюць мігранты — і працуюць добра, кіраўніцтва імі задаволена.

**«Да іх трэба ставіцца як да сваіх, і дзетак навучаць, і лячыць людзей трэба. Па-беларуску: кінь наперад — потым знойдзеш. Гэта ж нашы людзі», — адзначыў Прэзідэнт.**

І ён зрабіў акцэнт на тым, што пажадана, каб мігранты прыязджалі сем'ямі — так будзе больш матывацыі сумленна і якасна працаваць у Беларусі. Пры гэтым беларускі лідар нагадаў аб адказнасці кіраўнікоў прадпрыемстваў і мясцовых органаў улады за людзей, якія прыязджаюць з іншых краін.

Працэс узвядзення будынка з драўляных канструкцый больш працаёмкі, чым з жалезных: многія элементы даводзіцца збіраць уручную. Але будаўнікі спраўляюцца. Працуюць і па выхадных, для кароткай размовы з Прэзідэнтам зрабілі невялікі перапынак. «Вы будуеце эксперыментальны кароўнік, паглядзім, што тут будзе. Будзем тыражаваць такое па ўсёй Беларусі», — адзначыў Прэзідэнт. «Малайцы, хлопцы, дзякуй», — пахваліў будаўнікоў кіраўнік дзяржавы.

Андрэй Елісееў, намеснік дырэктара ААТ «Гомельскі аб'яднаны будаўнічы трэст», ён жа кіраўнік праекта, далажыў аб ходзе будаўніцтва, асаблівасцях работ. У будаўніцтве ўлічаны ўсе нюансы і недахопы малочнатаварных комплексаў: напрыклад, пашыраны кармавы стол для жывёл, зроблены вышэйшымі стойлы, удасканалена ўборка гною. Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт на тым, што ўсё павінна быць па тэхналогіі — увесь шлейф: ад кармоў да тэхнікі. «Працуй. Увесну пабудзем, паглядзім тут. Але каб усё ўжо было (пабудавана і працавала. — **«Зв.»**)», — сказаў лідар краіны, звяртаючыся да кіраўніка гаспадаркі. Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуўся да дырэктара «Парахонскага» Уладзіміра Храленкі: «Пакуль тут працуй. Не сыходзь. Тое, што трэба, дапамагай, давай парады». Уладзімір Храленка заўважыў, што яны з калегамі з «Агра-Ляскавічы» супрацоўнічаюць плённа і вучні тут добрыя.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў перспектыве будаўніцтва падобных комплексаў трэба распаўсюдзіць уздоўж усёй Прыпяці. Але ў кожным выпадку неабходна ўлічваць мясцовыя асаблівасці, бо важна не само будаўніцтва, а каб гэтыя комплексы былі задзейнічаны як след. «Для гэтага павінны быць задзейнічаны севазвароты. «Парахонскае» трэба браць за ўзор», — сказаў Прэзідэнт.

У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы зрабіў акцэнт на важнасці меліярацыі, што асабліва актуальна для Палесся.

**«Землі прыродзе аддаваць нельга. У нас меліяраваныя землі. Трэба іх даглядаць», — падкрэсліў беларускі лідар.**

Ён заявіў, што абслугоўванне меліярацыйных сістэм, ды і ўся работа па меліярацыі — гэта дзяржаўная справа. Але і кіраўнікі гаспадарак не павінны забываць аб сваёй адказнасці. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, варта нармальна плаціць тым гаспадаркам, што, як «Парахонскае», бяруць на сябе работы па меліярацыі і абслугоўванні меліярацыйных сістэм. «Дзяржаўная справа — глеба, землі, меліярацыя. Дзяржава павінна заплаціць. Вы дапамагаеце ўводзіць у севазварот землі і на гэтым капейку можаце зарабіць», — сказаў Прэзідэнт

### «СТАРШЫНЯ РАЙВЫКАНКАМА КІРУЕ РАЁНАМ ЦАЛКАМ»

Усіх адказных кіраўнік дзяржавы строга папярэдзіў: неабходна прымаць усе меры, каб вырашыць праблему падзяжу жывёлы. «Гэта не справа, што ў XXI стагоддзі гіне жывёла», — заявіў Прэзідэнт. А сакрэт, як заўсёды, у дысцыпліне і захаванні тэхналогій жывёлагадоўлі. Гэта датычыцца ў тым ліку і старшынь райвыканкамаў, якія нясуць адказнасць за ўсё, што адбываецца ў іх раёне. «Старшыня райвыканкама кіруе раёнам цалкам. Арганізацыйна», — нагадаў кіраўнік дзяржавы.

Зона адказнасці кіраўнікоў райвыканкамаў — сельскагаспадарчая тэхніка. Прэзідэнт успомніў свой тэзіс, агучаны напярэдадні падчас наведвання Салігорскага раёна: дарагую тэхніку варта перадаваць у першую чаргу моцным гаспадаркам, але з абавязацельствам дапамагаць тым, хто не можа яе абслугоўваць. «Я такім чынам хачу падштурхнуць слабыя гаспадаркі да таго, каб тыя трактары, якія мы дапаможам купіць, яны маглі абслужыць, — патлумачыў кіраўнік дзяржавы. — Трэба звяртаць увагу, каму мы аддаём тэхніку». Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што трэба вызначыцца з тэрмінамі эксплуатацыі сельскагаспадарчай тэхнікі.

Прэзідэнт пацікавіўся ў старшыні Петрыкаўскага райвыканкама Аляксандра Верамеева, як ідуць справы ў раёне. Быў атрыманы адказ, што ў цэлым усё добра, але, як заўсёды, ёсць месца чалавечаму фактару. Паступова пытанне вырашаецца. Напрыклад, нядаўна ў Ляскавічах быў пабудаваны дом на 24 кватэры для спецыялістаў, якія працуюць у гаспадарцы. Гэта своеасаблівы стымул для моладзі заставацца ў гэтай мясцовасці, а не імкнуцца ў горад. Аляксандр Лукашэнка такі падыход пахваліў. Ён заўважыў, што, дапамагаючы з жыллём шматдзетным сем'ям, трэба будаваць яго ў сельскай мясцовасці, каб не сцягваць усіх у гарады.

У цэлым кіраўнік дзяржавы не сумняваецца, што праблемныя пытанні будуць вырашаны.

**«Свет прыступіў да пераразмеркавання. Свет падзяліць хочуць. Таму нам няма куды дзявацца. Вяртацца і, як продкі, у лапцях хадзіць не хочацца. Трэба Палессе ў прытомнасць прыводзіць і вяртаць», — канстатаваў Прэзідэнт.**

Ён звярнуў увагу, што для вяртання Палесся варта прытрымлівацца зацверджанай у студзені гэтага года праграмы развіцця раёнаў Прыпяцкага Палесся на 2025—2030 гады. Яна была распрацавана ў адпаведнасці з даручэннем Прэзідэнта Беларусі. «Каб гэта не марна было», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА.**
*аг. Ляскавічы.*

## Даслоўна



У размове з журналістамі **старшыня Петрыкаўскага райвыканкама Аляксандр ВЕРАМЕЕЎ** адзначыў, што ўзвядзенне мадэрнізаванага малочнатаварнага комплексу забяспечыць раёну павелічэнне вытворчасці малака, павысіць камфорт для працы работнікаў прадпрыемства і дапаможа выканаць пастаўленыя задачы па жывёлагадоўлі. «Гэта першы комплекс з драўляных канструкцый. І я думаю, што гэты досвед будзе запатрабаваны ад Гомеля да Брэста», — падкрэсліў Аляксандр Верамееў.



**Дырэктар ААТ «Парахонскае» Уладзімір ХРАЛЕНКА**, кажучы пра новы комплекс, заўважыў, што на гэтым аб'екце ўлічылі ўсё, што цяпер трэба для эфектыўнага ўтрымання жывёлы. Ён падкрэсліў, што ўсе тэхналагічныя і інжынерныя рашэнні, якія выкарыстаны на этапах праектавання і будаўніцтва, будуць актуальныя найбліжэйшыя дзясяткі гадоў. Па сутнасці, гэта малочнатаварны комплекс новага пакалення, дзе сабраныя найлепшыя падыходы. У тым ліку тут улічылі моманты, якія выкарыстоўваліся і пры будаўніцтве такіх аб'ектаў у «Парахонскім».

«Галоўнае — чалавека не трэба перавучваць. Ён слухае і робіць. Гэта вялікая справа. Перавучыць чалавека складана, навучыць проста, — упэўнены Уладзімір Храленка. — Інфармацыю, атрыманую за ўсе гады, не трымаю ў сябе, дзялюся. І гэта дае свае вынікі. Як я кажу, у мяне няма канкурэнтаў, бо я па-за канкурэнцыяй. А вось ім гэта трэба». Кіраўнік «Парахонскага» расказаў, што ў «Агра-Ляскавічы» прымаюць карысныя парады, паколькі зацікаўлены ў эфектыўнай працы.

У «Агра-Ляскавічы» клапоцяцца аб сваіх работніках, у тым ліку і аб тых, хто прыязджае з-за мяжы. Вепа Дурдыеў працуе ўжо тры месяцы памочнікам цялятніцы. Мужчына прыехаў з Туркменістана. «Работа тут выдатная. Начальства, калегі добра ставяцца. Кватэру далі, усім забяспечаны. Планую затрымацца надоўга, бо ўсё падабаецца», — падзяліўся ён.





ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «Гараторг групп», УНП 691734271, 222161, г. Жодино, пр-т Мира, д. 19а, пом. 28 |

| № п/п | Наименование предмета электронных торгов | Общая площадь, кв. м | Начальная цена (с НДС 20 %), долл. США* |
|---|---|---|---|
| 1 | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18830 | 5,3 | **20 487,60** |
| | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18831 | 48,9 | |
| 2 | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18836 | 15,2 | **6 320,16** |
| 3 | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18837 | 15,2 | **6 320,16** |
| 4 | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18841 | 49,6 | **17 677,44** |
| 5 | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18842 | 25,9 | **9 230,76** |
| 6 | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18847 | 18,2 | **38 911,75** |
| | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18848 | 14,8 | |
| | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18849 | 14,9 | |
| | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18850 | 17,0 | |
| | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18851 | 14,7 | |
| 7 | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18853 | 12,7 | **4 526,28** |
| 8 | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18854 | 22,6 | **13 863,96** |
| | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18855 | 16,3 | |
| 9 | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18856 | 21,4 | **7 626,96** |
| 10 | Административное помещение, инв. номер 612/D-28362 | 107,2 | **19 899,00** |

**Местоположение: Минская область, г. Жодино, пр-т Мира, д. 19а**

*Оплата предмета электронных торгов производится в белорусских рублях в сумме, эквивалентной цене продажи лота в долл. США по курсу НБРБ на дату проведения платежа

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату внесения платежа на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи (если не достигнута иная договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона)

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение от **4 %** до **6 %** от цены продажи в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 04.09.2025 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 20.10.2025 г. с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **17.10.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |



**Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ**

| Предметы торгов | Начальная цена, руб. (без НДС) | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **Лот № 1:** легковой минивэн PEUGEOT 807, год выпуска 2002 г., регистрационный знак 6160 ЕВ-1, кузов № VF3EBRHTB13024844 | 6 900,00 | 690,00 |
| **Лот № 2:** автобус-вагон А 0921 «RADZIMICH», год выпуска 2011 г., регистрационный знак AI 0011-1, кузов № Y39A03210B0019006 | 5 000,00 | 500,00 |
| **Лот № 3:** вулканизатор шиноремонтный В101, год выпуска 2004 г., инвентарный номер 01323347 | 330,00 | 33,00 |
| **Лот № 4:** устройство удаления выхлопных газов для Г/А FAN-150, серийный номер 11-012252-ELET, год выпуска 2011 г. | 1 200,00 | 120,00 |
| **Лот № 5:** устройство удаления выхлопных газов для Г/А FAN-150, серийный номер 11-012253-ELET, год выпуска 2011 г. | 1 200,00 | 120,00 |
| **Лот № 6:** устройство удаления выхлопных газов для Г/А FAN-150, серийный номер 11-014375-ELET, год выпуска 2011 г. | 1 200,00 | 120,00 |
| **Лот № 7:** устройство удаления выхлопных газов для Г/А FAN-150, серийный номер 11-014377-ELET, год выпуска 2011 г. | 1 200,00 | 120,00 |

**Местонахождение объекта торгов:** г. Брест, ул. Гаврилова, 45.
**Продавец:** Брестская таможня, 224028, г. Брест, ул. Гаврилова, 45, тел./факс 80162470183

**Электронные торги состоятся 11 ноября 2025 г. в 11.00**

**Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь au.nca.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG»**

**Организатор электронных торгов, оператор электронной торговой площадки:**
Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162 40 87 01, 40 87 41, brest@ino.by

**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**


# «У НАС ЁСЦЬ МАГЧЫМАСЦІ, ЁСЦЬ РЭСУРСЫ»

## Дзмітрый КРУТОЙ — аб прапановах для расійскага рынку

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Дзмітрый Крутой у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» расказаў аб беларускіх прапановах для расійскага рынку.



Паводле яго слоў, апошняя сустрэча лідараў дзвюх краін паказала, што, нягледзячы на тое, што агульны тавараабарот таварамі і паслугамі складае амаль 60 мільярдаў долараў, яму ёсць куды расці, і магчымасці вялікія.

**— У нас нядрэнная сітуацыя ў банкаўскай сферы, сітуацыя з фінансамі і бюджэтам. Мы можам пераразмеркаваць частку рэсурсаў на добрыя экспартныя кантракты, — адзначыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта, выказаўшы пажаданне, каб гэтыя кантракты былі доўгатэрміновыя. — Тры і больш гадоў, але калі ёсць выгадныя кантракты, як кажуць, тут і цяпер (нават гадавыя), то трэба такія праграмы прапаноўваць.**



Ён растлумачыў, што ў расійскага боку на рынку цяпер дастаткова высокія працэнтныя стаўкі, а аб'ём субсідый, лізінгавых праграм значна сціснуты.

— Таму ў нас ёсць магчымасці, ёсць рэсурсы гэту нішу заняць і падтрымаць нашых вытворцаў.

Дарэчы, Дзмітрый Крутой адзначыў, што паказчык тавараабароту з некаторымі расійскімі рэгіёнамі вышэйшы за сярэднія лічбы.

— Мы хацелі б выйсці на лічбы 103-105 % тавараабароту. Я цяпер кажу канкрэтна па таварах, таму што ў сферы паслуг лічбы нядрэнныя — гэта транспартныя, будаўнічыя, IT-паслугі. Там усё якраз развіваецца нядрэнна, і там трэба проста загружаць адпаведныя прадпрыемствы і маштабавацца — з адных рэгіёнаў Расіі пераходзіць у іншыя. На самай справе сітуацыя вельмі простая.

Ён дадаў, што па традыцыйных прамысловых таварах бакі праселі, але гэта кампенсавана прадуктамі харчавання, металургіяй, часткова лёгкай прамысловасцю.

— Таму і агульныя сярэднія лічбы на сённяшні дзень выглядаюць дастаткова прымальна, — рэзюмаваў Дзмітрый Крутой.

АКТУАЛЬНА

# РАЗВІЦЦЁ АТАМНАЙ ГЕНЕРАЦЫІ

## Міністр энергетыкі — аб перспектыве ўдасканалення энергасістэмы краіны

Міністр энергетыкі Дзяніс МАРОЗ у эфіры тэлеканала СТБ расказаў аб перспектыве ўдасканалення энергасістэмы краіны, у тым ліку за кошт развіцця атамнай генерацыі.



Дзяніс Мароз праінфармаваў, што ў адпаведнасці з даручэннем кіраўніка дзяржавы ведамствам распрацоўваецца тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне, у рамках якога аналізуюцца два прынцыпова розныя варыянты.

— Адзін варыянт — будаўніцтва яшчэ аднаго блока на тэрыторыі Беларускай атамнай электрастанцыі. І перавага гэтага варыянта заключаецца ў тым, што ён дае магчымасць у больш кароткія тэрміны рэалізаваць такі праект, а таксама выкарыстоўваць існуючую тэхналагічную інфраструктуру на пляцоўцы атамнай электрастанцыі. Акрамя таго, ён дае магчымасць выкарыстоўваць інфраструктуру сацыяльную, гэта значыць сам горад Астравец, дарогі, людзі, медыцына, усё тое, што створана вакол. Гэта дазваляе істотна знізіць затраты на само будаванне і, адпаведна, атрымаць даволі высокую эфектыўнасць рэалізацыі ўсяго праекта.

Міністр канстатаваў, што існуе і альтэрнатыва.

— Можна рэалізоўваць новы праект Беларускай атамнай электрастанцыі. Тады ўжо не прывязвацца да пляцоўкі існуючай электрастанцыі, а недзе ў іншым рэгіёне (а найбольш перспектыўным на гэты момант бачыцца ўсходні напрамак рэспублікі) пабудаваць двухблочную такую ж атамную электрастанцыю. У гэтага варыянта ёсць набор сваіх пераваг, галоўнай з якіх з'яўляецца менавіта сацыяльны фактар, таму што само па сабе будаўніцтва атамнай станцыі — магутны імпульс для рэгіянальнага развіцця. Цяпер адбываецца ўзважванне ўсіх плюсаў аднаго і другога варыянтаў для таго, каб прыняць найбольш правільнае і дакладнае рашэнне ў інтарэсах нашай краіны — не на бягучы момант, а на стратэгічную перспектыву, — падкрэсліў Дзяніс Мароз.

**Паводле БелТА.**



ПЕРСПЕКТЫВА

# ДАКЛАДНЫЯ ПЛАНЫ НА ПЯЦІГОДКУ

## Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця павінна быць зразумелая кожнаму жыхару

У пачатку кастрычніка Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў распараджэнне, якім створана рабочая група па дапрацоўцы праекта Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2026—2030 гады. У яе склад уключаны дэлегаты Усебеларускага народнага сходу, дзеючыя і былыя кіраўнікі органаў дзяржаўнай улады, арганізацый рэальнага сектара эканомікі, навуковых і грамадскіх арганізацый. Кіраўніком рабочай групы прызначаны старшыня праўлення Нацыянальнага банка Раман ГАЛОЎЧАНКА.

### СІСТЭМНЫ ПАДЫХОД

Старшыня Нацбанка на пасяджэнні рабочай групы адзначыў, што асаблівасцю гэтай праграмы з'яўляецца тое, што яна ўпершыню падлягае зацвярджэнню на Усебеларускім народным сходзе ў адпаведнасці з прынятымі зменамі ў Канстытуцыю. Па словах Рамана Галоўчанкі, прапановы па дапрацоўцы праграмы перш за ўсё датычацца выкарыстання сістэмнага падыходу ў выбудоўванні прыярытэтаў сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, забеспячэння іх узаемнай увязкі з актуальнымі праблемамі і перспектывамі развіцця.



Фота БелТА.

«Асноўнай мэтай прадстаўнічай рабочай групы з'яўляецца аператыўная дапрацоўка праекта праграмы з улікам меркавання членаў Усебеларускага народнага сходу. Асабліва падкрэслю, што наша задача — не напісаць нейкі новы дакумент. Нагадаю, што канцэпцыю праекта ў цэлым кіраўнік дзяржавы ўзгадніў. Работа праведзена вялікая, і базавую аснову дакумента мы падтрымліваем. Мэта ў нас адна — зрабіць адзіны дакумент будучага развіцця краіны. І гэты дакумент павінен быць максімальна простым для ўспрымання, каб кожнаму грамадзяніну было зразумела, якіх мэт плануе дасягнуць краіна за найбліжэйшыя пяць гадоў», — растлумачыў Раман Галоўчанка.

### ПРЫЯРЫТЭТЫ І ЗАДАЧЫ

Кіраўнік Нацбанка падкрэсліў, што работа з праектам праграмы павінна весціся ў поўнай адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства аб дзяржаўным прагназаванні. Менавіта там прапісана іерархія пабудовы праграмы. «На наш погляд, прыярытэты пяцігодкі павінны быць канкрэтнымі і адначасова аб'ёмнымі, накіраванымі на дасягненне мэт гэтага часу, спрыяць ліквідацыі розных сістэмных дыспрапорцый, якія яшчэ сустракаюцца, напрыклад арэнднае жыллё, рамонт і будаўніцтва дарог і гэтак далей. Акрамя таго, павінна быць забяспечана спалучанасць гэтых прыярытэтаў з прыярытэтамі нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця да 2040 года. Нагадаю, іх там пяць: сямейныя каштоўнасці і асобасны рост, якасная адукацыя, тэхналагічная незалежнасць і пабудова інтэлектуальнай эканомікі, канкурэнтнае і даступнае бізнес-асяроддзе, экалагічная бяспека і рэсурсная эфектыўнасць. Адсюль і задача рабочай групы — трэба ўдакладніць прыярытэты пяцігодкі», — падкрэсліў Раман Галоўчанка.

Па яго словах, яшчэ да першага пасяджэння члены рабочай групы падрыхтавалі прапанаваныя прыярытэты ў развіцці краіны. «Першае — захаванне насельніцтва, умацаванне здароўя нацыі і падтрымка сям'і. Другое — развіццё чалавечага патэнцыялу, якасная адукацыя, выхаванне гарманічнай і патрыятычнай асобы. Трэцяе — стварэнне якаснага і зручнага асяроддзя для жыцця. Чацвёртае — рост канкурэнтаздольнасці нацыянальнай эканомікі і паскарэнне тэхналагічнага развіцця. Пятае — лічбавая трансфармацыя эканомікі і дзяржаўнага кіравання, развіццё эканомікі даных. Шостае — развіццё ўнікальнага патэнцыялу кожнага рэгіёна.

«З іншага боку, індыкатары павінны адлюстроўваць мэту па павышэнні канкурэнтаздольнасці краіны, навукаёмістасць, прадукцыйнасць. Гэта класіка, без якой немагчыма абысціся. Таму трэба паглядзець, якія макрапаказчыкі павінны быць уключаны ў праграму і, самае галоўнае, выставіць іх дастатковы ўзровень», — дадаў Раман Галоўчанка

Ён адзначыў, што праведзеная ўрадам і Міністэрствам эканомікі работа над праектам Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця ў цэлым заслугоўвае высокай ацэнкі. Але ёсць прабелы, якія трэба дапрацаваць, і зрабіць гэта рабочая група зможа толькі разам з урадам. «Таму вялікая нагрузка кладзецца і на Міністэрства эканомікі, і на галіновыя міністэрствы».

**Сяргей КУРКАЧ.**

**У тэму**

### Драйверы росту

Як адзначыў журналістам **намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Андрэй КАРТУН**, асноўны пасыл пяцігадовай праграмы — рост эканомікі не ніжэй за сярэднесусветны ўзровень. «Ён, у прынцыпе, захоўваецца. Але самае галоўнае — гэта паскоранае інвестыцыйнае развіццё, каб інвестыцыі апярэджвалі тэмпы эканамічнага росту, што стварае задзелы для будучага стабільнага росту. Згодна з нацыянальнай стратэгіяй устойлівага развіцця Беларусі на перыяд да 2040 года, мы ставім задачу ўвайсці ў топ-50 краін па ўзроўні ВУП на душу насельніцтва па парытэце пакупніцкай здольнасці. У нас ёсць усе шанцы гэта зрабіць, таму таксама трэба паглядзець, чым мы зоймемся ў найбліжэйшыя пяць гадоў, каб значна паскорыць гэты працэс», — падкрэсліў Андрэй Картун.

Адной з задач пяцігадовай праграмы ён назваў вызначэнне выклікаў, якія стаяць перад эканомікай. «Гэта і геапалітычная сітуацыя, і пэўная турбулентнасць на асноўных рынках збыту, і гэтак далей. Наша задача, з аднаго боку, — акрэсліць дастаткова амбіцыйныя планы развіцця, а з другога боку — вызначыць, як эканоміка зможа адаптавацца да тых ці іншых шокаў і быць гатовай да іх», — заключыў намеснік старшыні праўлення Нацбанка.

## СЯМЕЙНЫЯ ПЫТАННІ АБМЯРКУЙЦЕ З СЕНАТАРАМІ

Члены Савета Рэспублікі 8 кастрычніка правядуць прамыя тэлефонныя лініі па пытаннях сямейнай палітыкі і ўдасканалення заканадаўства ў сферы шлюбу і сям'і.

Званкі ад грамадзян будуць прымацца з 16.00 да 18.00.

Падрабязны анонс з указаннем тэлефонаў, па якіх члены Савета Рэспублікі будуць прымаць тэлефанаванні, размешчаны на афіцыйным сайце, а таксама ў тэлеграм-канале Савета Рэспублікі.

ПРЫЯРЫТЭТЫ

# ДЗЕЛЯ АБАРОНЫ ДОБРАСУМЛЕННЫХ БРЭНДАЎ І ДЗЕЛАВОЙ РЭПУТАЦЫІ

## У Мінску праходзіць XIII міжнародны форум «Антыкантрафакт-2025»

Гэты прадстаўнічы форум (у беларускую сталіцу з'ехалася каля паўтысячы ўдзельнікаў) з'яўляецца ўнікальнай міжнароднай пляцоўкай для эфектыўнага процідзеяння незаконнаму абароту прамысловай прадукцыі і абароны правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза, паведаміла БелТА.



Як адзначыла **намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Наталля ПЯТКЕВІЧ**, сёлета Беларусь старшынствуе ў органах ЕАЭС. «Кантрафакт — не толькі пагроза для добрасумленных вытворцаў і праваўладальнікаў, але і маштабны выклік для дзяржавы, эканомікі, бізнесу, міжнароднага супрацоўніцтва і, што яшчэ больш важна, бяспекі людзей», — адзначыла Наталля Пяткевіч.

Віцэ-прэм'ер дадала, што Беларусь узяла найлепшае з савецкіх часоў, у тым ліку найвышэйшую якасць вытворчасці — ад прадуктаў харчавання да машынабудавання, фармацэўтыкі і іншых тавараў. «Мы вельмі беражом імя сваіх брэндаў, сваю рэпутацыю. Тыя рэпутацыйныя выдаткі, якія могуць быць нанесены за кошт кантрафакту, часам нават вышэйшыя, чым падатковыя выдаткі або непаступленні (падаткаў. — **Заўв. рэд.**)», — дадала Наталля Пяткевіч. У якасці прыкладу яна прывяла факты падробкі беларускіх прадуктаў харчавання, у тым ліку згушчонкі, глазураваных сыркоў.

У Беларусі тэма дзяржаўных стандартаў і абароны інтэлектуальнай уласнасці знаходзіцца на прыярытэтным узроўні увагі, падкрэсліла Наталля Пяткевіч. «Мы ў многіх пытаннях з'яўляемся флагманамі, а там, дзе такімі не з'яўляемся, — актыўнымі праваднікамі барацьбы за высокія стандарты якасці і барацьбы з кантрафактам, — сказала Наталля Пяткевіч, дадаўшы, што ва ўмовах глабалізацыі, лічбавізацыі, імклівага развіцця рынку тэма набывае яшчэ большае значэнне. — Задача нумар адзін — выпрацаваць эфектыўную сістэму аховы інтэлектуальных правоў, каб і абараніць прадукцыю, і дазволіць своечасова выявіць парушэнні, і, самае галоўнае, іх папярэджваць».

Віцэ-прэм'ер таксама звярнула ўвагу на неабходнасць фарміравання культуры захавання правоў інтэлектуальнай уласнасці, выплаты падаткаў. «Барацьба з кантрафактам, асабліва ў цяперашніх умовах, немагчымая без узаемадзеяння дзяржаўных органаў як унутры краіны, так і на міжнароднай арэне. І Еўразійскі эканамічны саюз — тая ўнікальная і плённая пляцоўка, якая праявіла ўжо кансалідацыю ў гэтым пытанні», — адзначыла Наталля Пяткевіч.



Значнасць абароны рынкаў ад кантрафактнай прадукцыі асабліва ўзрастае ў апошнія гады, падкрэсліў **старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь Сяргей ШЛЫЧКОЎ**. Гэта звязана з тэхнічным прагрэсам і бурным укараненнем інавацыйных распрацовак у эканоміку і іншыя сферы. Паводле меркавання Сяргея Шлычкова, ва ўмовах імклівага росту тавараабароту і лічбавізацыі гандлю назіраецца актыўнае распаўсюджванне кантрафактнай прадукцыі ў лічбавай прасторы. Усё гэта патрабуе прыняцця эфектыўных мер па выяўленні і спыненні выхаду кантрафакту на рынкі.



Фота БелТА.



# ХЛЕБАРОБАМ – ПАВАГА І ПАШАНА

Кіраўнік дзяржавы абавязкова прысутнічаў на кожным фестывалі і не толькі асабіста ўшаноўваў хлебаробаў, якія занялі першыя месцы, але і аналізаваў зробленае, ставіў задачы на будучыню. За прыгожым святам хаваецца вялікі сэнс, які ўкладвалі нашы продкі — каб праз год ураджай абавязкова парадаваў. У 2014 годзе па прапанове Прэзідэнта рэспубліканскія «Дажынкі» памянялі фармат: праводзіць іх сталі на абласным узроўні ў райцэнтрах. Тым не менш увага з боку кіраўніка дзяржавы да галоўнага свята працаўнікоў вёскі па-ранейшаму застаецца самая пільная. У суботу, 4 кастрычніка, ён накіраваў прывітальныя адрасы адразу ў тры рэгіёны: на Брэстчыну (Белаазёрск), Віцебшчыну (Чашнікі) і Магілёўшчыну (Крычаў), дзе якраз і праходзілі абласныя «Дажынкі». Карэспандэнты «Звязды» былі на месцах і ўсё бачылі на свае вочы.

## «ДАЖЫНКІ» Ў ЧАШНІКАХ: ПОЎНАЯ ЧАША РАДАСЦІ

Толькі на галоўнай сцэне абласнога фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі Віцебшчыны было ўручана каля сотні ўзнагарод. Ганаровыя граматы, падзячныя лісты, грашовыя сертыфікаты, трактар, скутэры і пуцёўкі ў санаторый — усё героям жніва, прадпрыемствам і перадавікам.

Гарачая пара ўборачнай паказала, што на Віцебшчыне працуюць людзі асаблівай загартоўкі, якія вылучаюць працавітасць і адданасць абранай справе. Паўночны рэгіён сабраў 1 млн 5 тысяч тон зерня і алейнага семя, атрымаўшы ураджайнасць збожжавых 30,8 ц/га. Па аб'ёмах збору алейнага семя рэгіён перабольшыў вал у 100 тысяч тон, а ураджайнасць рапсу ўстанавіла рэкорд — 18,1 ц/га.

«Сярод флагманаў — СВК «Ларынаўка» і ААТ «Агракамбінат «Юбілейны» Аршанскага раёна», філіял «Сельскагаспадарчая вытворчасць «Мазалаўга» Віцебскага раёна», сельскагаспадарчы філіял «Кляўцы» КУП «Віцебскаблдарбуд» Лёзненскага раёна, ААТ «Хацілы-Агра» і «Навасёлкі-Лучай» Пастаўскага раёна», — назваў лідараў **старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН.** Кіраўнік Віцебшчыны выказаў словы шчырай падзякі Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцям, якія падставілі плячо аграрыям паўночнага рэгіёна.

Ва ўборачнай было занята больш за тысячу камбайнераў і экіпажаў камбайнаў. Чэмпіёнам сярод іх стаў Максім Сярноў з агракамбіната «Юбілейны», які на КЗС-2124 намалаціў 4,5 тысячы тон зерня і рапсу.

Падчас падрыхтоўкі да «Дажынак» было створана выразнае аблічча Чашнікаў. Поўнасцю заменена асфальтабетоннае пакрыццё на цэнтральных і ўязных вуліцах, аднаўлена звыш за 75 тысяч «квадратаў» вуліц і 20 тысяч — тратуараў, адноўлены мост праз водаканал. Выкананы капітальны рамонт 13 шматкватэрных дамоў, добраўпарадкаваны дваравыя тэрыторыі, з'явіліся новыя зоны адпачынку і малыя архітэктурныя формы. Мадэрнізаваны хірургічны корпус Новалукомскай ЦРБ — там адкрыты кабінет камп'ютарнай тамаграфіі. Пераўтварыліся сацыяльна значныя аб'екты: гімназія, дзіцячая школа мастацтваў і бібліятэка, раённы цэнтр культуры і народнай творчасці. З'явіўся новы аўтазаправачны комплекс, а ў дзень фестывалю-ярмаркі адбылося ўрачыстае адкрыццё ўзведзенага з нуля пад ключ будынка разлікова-касавага цэнтра РУП «Віцебскэнерга».

Новае прыватнае прадпрыемства — ТАА «Лукомскі кансервавы завод» — адкрылася ў самым маладым горадзе Беларусі Новалукомлі. Гэта ўдалося зрабіць дзякуючы рэалізацыі ініцыятывы Прэзідэнта «Адзін раён — адзін праект». Кошт узвядзення кансервавага завода склаў больш за 18 млн рублёў. Акрамя ўласных сродкаў інвестара выкарыстаны прадастаўленыя дзяржавай ільготныя крэдыты на суму больш за 13 млн рублёў.

«Адкрыццё гэтага завода — падзея не толькі для Чашніцкага раёна, але і для ўсёй вобласці, — падкрэсліў **старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЕЯНКА.** — За год пабудаваць такое прадпрыемства — гэта выдатна! Гэта паспяховы прыклад беларускага бізнесу. Гэта ўклад у эканоміку вобласці, новыя працоўныя месцы». Шматфункцыянальны кансервавы завод арыентаваны на перапрацоўку прэснаводнай і марской рыбы, морапрадуктаў. На пачатковым этапе плануецца перапрацоўваць каля 70 тон сыравіны за месяц. Чакаецца, што з выхадам на поўную вытворчую магутнасць у год будзе выпускацца каля 725 тон рыбных кансерваў і прэсерваў. На новым прадпрыемстве створана 44 працоўныя месцы, у перспектыве колькасць персаналу можа павялічыцца да 70 чалавек.

Уборачную гэтага года ў Віцебскай вобласці Старшыня Палаты прадстаўнікоў назваў сапраўднай бітвай за ураджай: «Лёгкага хлеба не бывае, гавораць у народзе. І тут не паспрачаешся. Працаваць у вёсцы ва ўсе часы было няпроста, а ва ўмовах гэтага года — архіскладана. Бываючы ў раёнах і на канкрэтных прадпрыемствах, я на свае вочы бачыў, як цяжка было не тое што працаваць — выйсці на поле». Ён параўнаў прыроду з самым суровым экзаменатарам, падкрэсліўшы, што асабліва актуальна гэта для Віцебшчыны, паўночнага рэгіёна Беларусі. А такіх умоў, якія былі сёлета, не згадаюць ні старажылы, ні ветэраны сельгаспадарчай галіны. Тым не менш жорсткую праверку аграрыі Віцебшчыны вытрымалі, супрацьпаставіўшы капрызам прыроды дакладную арганізацыю працы, высокую культуру земляробства, дысцыпліну, зладжанасць дзеянняў усіх звёнаў АПК.

**Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір ПЯРЦОЎ** выказаў думку, што традыцыя правядзення восеньскага свята ўраджаю неабходна народу і краіне. «Па-першае, мы працягваем і шануем традыцыі нашых продкаў. Свята ўраджаю мае глыбокую гісторыю і глыбокі сэнс. Мы разумеем, што ідзём у зіму, у наступным годзе будзем сытыя, з ураджаем, з хлебам, будзем шчаслівыя, будзем жыць. Па-другое, гэта нагода падзякаваць людзям за іх нялёгкую сельскую працу». Ён адзначыў, што ўсё, што сабрана і нарыхтавана, захаваецца і перапрацуецца, а лішкі будуць прададзены на экспарт. Гэта таксама важны артыкул бюджэту нашай краіны.

Гаворачы аб выніках аграрнага сезона і агульным намалоце рэгіёна па збожжавых і зернебабовых, якія перавысілі мільён тон, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта падкрэсліў, што такі вынік аграрыі выканалі дзякуючы агульным намаганням: «Залог поспеху — у працы і высокай арганізацыі гэтай працы, паколькі цяпер сельская гаспадарка на 80 % не залежыць выключна ад надвор'я, хоць спачатку ўсе скардзіліся на дажджлівае лета. Гэта таксама тэхналогіі і захаванне гэтых тэхналогій. Натуральна, шмат сучаснай тэхнікі, якой у нас хапае, у тым ліку айчыннай вытворчасці ў першую чаргу. Ну і праца — нялёгкая, ад світання да заходу сонца».

У сваю чаргу **першы намеснік Прэм'ер-міністра Мікалай СНАПКОЎ** назваў зробленае аграрыямі паўночнага рэгіёна працоўным подзвігам і простым чалавечым цудам. Ён пацвердзіў сваё заяўленне лічбамі: «У ліпені было 18 дажджлівых дзён, у жніўні, самую гарачую пару, — 25. Тым не менш Віцебская вобласць на 40 % палепшыла валавы збор збожжа да ўзроўню мінулага года, сабрала больш за 1 млн тон збожжа і рапсу».

У наступным годзе аграрыі Віцебскай вобласці будуць адзначаць «Дажынкі» ў Мёрах.




## АДКРЫЦЦІ «ДАЖЫНАК» ДЛЯ КРЫЧАВА

Свята запомніцца перш за ўсё яркімі фарбамі, вялікай колькасцю гасцей і пераможцаў. Нават надвор'е, якое апошнім часам часцей пахмурнае, у гэты дзень радавала бязвоблачным блакітным небам і яркім сонейкам. Фестывальныя лакацыі ад гэтага здаваліся яшчэ больш прыгожыя і багатыя.

З раніцы ў горадзе гучала музыка, перарazaліся стужкі на новых аб'ектах. Самым маштабным з іх стала паліклініка, адкрыццё якой чакалі не толькі крычаўляне, але і жыхары бліжэйшых 9 раёнаў. Ліфты, безбар'ернае асяроддзе, дыягнастычнае медабсталяванне апошняга пакалення — гэта не проста паліклініка, а міжраённы медыцынскі цэнтр, дзе дапамога будзе аказвацца на самым высокім узроўні. Установа аб'яднала шэраг паліклінічных аддзяленняў, якія былі раскіданыя па ўсім горадзе, — дзіцячую паліклініку, станцыю хуткай дапамогі, стаматалогію.

**Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА** падчас адкрыцця назваў падзею знакавай. Ён адзначыў, што гэта мэтанакіраваная палітыка дзяржавы. «За апошнія 4 гады ў ахову здароўя вобласці ўкладзена 820 мільёнаў рублёў, з якіх 230 — сёлета. І гэта не канчатковая лічба. Сёння ў рабоце па вобласці знаходзіцца 55 медыцынскіх аб'ектаў».

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта, упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў Магілёўскай вобласці Дзмітрый КРУТОЙ** паведаміў, што дзяржпраграма «Моцнае здароўе нацыі» — адна з прыярытэтных у будучай пяцігодцы. «За бліжэйшыя пяць гадоў мы павінны адшліфаваць краіну і давесці яе да ўзорнага стану, — нагадаў ён пасыл з перадвыбарнай праграмы Прэзідэнта. — Дзяржаўная праграма, накіраваная на моцную і здаровую нацыю, будзе адной з асноўных у наступным годзе, на яе будуць выдзелены вялікія рэсурсы».

Агульны кошт медыцынкай установы з тэхнічным начыннем — каля 60 мільёнаў рублёў. Галоўны ўрач Аляксандр Плятнёў падкрэсліў, што дзяржава ўдзяляе ўвагу якасці медыцынскай дапамогі незалежна ад таго, размова ідзе аб глыбінцы або аб сталіцы. У Крычаўскай ЦРБ усталяванае дарагое высокатэхналагічнае абсталяванне, у тым ліку МРТ і ангіёграф — трэці ў вобласці пасля Магілёва і Бабруйска.

Шмат прыгожых слоў прагучала з галоўнай сцэны фестывалю, дзе ўзнагароджвалі пераможцаў жніва. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый Крутой зачытаў прывітальны адрас Прэзідэнта з падзякай за добры ўраджай і пажаданнямі новых працоўных перамог. Ён адзначыў, што сёлетні вынік — гэта вынік сістэмнай працы, бо Прэзідэнт асабіста клапоціцца, каб сельская гаспадарка стала адной з вядучых у краіне галін. «Хочацца выказаць словы падзякі і нізкі паклон жыхарам Крычава і Крычаўскага раёна, а таксама арганізацыям Магілёўскай вобласці і краіны, якія на працягу двух гадоў рыхтавалі гэта свята. Паглядзіце, як змяніўся горад, колькі знакавых аб'ектаў абнавілася, якія выдатныя сталі дарогі, тратуары. Крычаў стаў яшчэ больш камфортны для жыцця нашых грамадзян, — адзначыў Дзмітрый Крутой. — Вы зрабілі вялікую працу».

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта заўважыў, што на палях завяршылася толькі частка работ. Вынік, які атрымалі сёлета аграрыі вобласці, — гэта вынік сістэмнай работы. «Я хачу падзякаваць старшыні аблвыканкама, таму што я памятаю, як летась мы абмяркоўвалі вынікі і планы. Усё было пастаўлена на больш высокі ўзровень. Займаючыся зменамі, угнаеннямі, выконваючы тэхналагічныя працэсы, Магілёўшчына паказала вынік практычна на ўзроўні лідараў у краіне», — сказаў Дзмітрый Крутой.

Паводле яго слоў, Прэзідэнт удзяляе каласальную ўвагу вынікам работы аграрыяў. «З аднаго боку, гэта велізарная адказнасць і велізарная падтрымка, якая прыводзіць да цудоўных вынікаў, якіх дасягнулі нашы вяскоўцы, дабіўшыся харчовай бяспекі ў нашай краіне і экспарту амаль на 9 мільярдаў долараў. У нас у 1995 годзе экспарт усёй краіны быў меншы, чым той вынік, які паказвае АПК сёння. Рэзервы велізарныя, асабліва ў эфектыўнасці продажаў нашай прадукцыі на знешніх рынках».

Магілёўская вобласць сёлета сабрала фактычна рэкордны ўраджай — з кукурузай атрымаецца каля 1,5 млн тон. «Цяпер задача з улікам добрых вынікаў нарыхтоўкі кармоў трансфарміраваць паказчыкі раслінаводства ў жывёлагадоўлю», — адзначыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

«Беларуская сельская гаспадарка — лепшая дыпламатыя», — рэзюмавала падчас уручэння грамат і ўзнагарод намеснік **Прэм'ер-міністра Наталля ПЯТКЕВІЧ.** «Мы знайшлі лепшы спосаб прадэманстраваць сябе на сусветнай арэне. Вы скарылі мільёны сэрцаў на ўсім кантыненце сваёй прадукцыяй, зрабілі фанатамі беларускіх прадуктаў людзей розных нацыянальнасцяў у розных кутках свету. Наш Прэзідэнт неаднаразова расказваў, што лідары шэрагу краін аддаюць перавагу беларускім прадуктам, якія ім вельмі падабаюцца. Дзякуй за вернасць роднай зямлі і за тое, што нагадваеце нам — хлеб даражэйшы за золата».




Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Ісачанка паведаміў са святочнай сцэны, што сёлетні ўраджай склаў 1 мільён 300 тысяч тон. Аграрыі Магілёўшчыны даказалі, што могуць дэманстраваць высокія вынікі. Пераможцамі штогадовага абласнога спаборніцтва за дасягненне высокіх паказчыкаў на ўборцы ўраджаю збожжавых і зернебабовых раслін сталі Шклоўскі, Кіраўскі і Магілёўскі раёны. Сярод сельскагаспадарчых і іншых арганізацый дыпломам Магілёўскага аблвыканкама I ступені і грашовай узнагародай у памеры 400 базавых велічынь адзначана СВ «Газавік-Сіпакова» РУП «Магілёўаблгаз».

«На хлебнай ніве Магілёўшчыны працуюць сапраўдныя прафесіяналы сваёй справы, якія любяць сваю зямлю, сваю краіну, — павіншаваў аграрыяў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, упаўнаважаны прадстаўнік Прэзідэнта на Магілёўшчыне Леанід ЗАЯЦ.** — Безумоўна, не было б такіх высокіх паказчыкаў, калі б не пастаянная ўвага, падтрымка сферы АПК Прэзідэнтам. Сёння мы дзякуем усім аграрыям за іх працу».

Свята ў Крычаве адшумела, наступнай яго сталіцай стане Шклоў. Падчас урачыстай цырымоніі ўшанавання пераможцаў жніва старшыня Крычаўскага райвыканкама Аляксей Шарай уручыў сцяг «Дажынак» кіраўніку Шклоўскага райвыканкама Сяргею Барташу.

## ГОРАД ЭНЕРГЕТЫКАЎ СУСТРЭЎ СВЯТА Ў НОВЫМ АБЛІЧЧЫ

Белаазёрск у дні правядзення абласных «Дажынак» ператварыўся ў сапраўдную жамчужыну Брэсцкага краю. За апошнія месяцы тут праведзена вялікая работа па добраўпарадкаванні: абноўлены фасады школ, дамоў і грамадскіх будынкаў, прыгажэюць вуліцы і двары, заззяў свежымі фарбамі Дом культуры.

Новы выгляд набыла і гарадская бальніца — яе тэрыторыя і фасад сталі прыкладам сучаснага камфортнага асяроддзя. Усяго капітальна адрамантавана больш за 40 жылых дамоў, добраўпарадкавана 18 дваровых тэрыторый, на гарадскіх вуліцах укладзена больш за 50 тысяч квадратных метраў асфальту.

Асаблівай гордасцю гараджан стаў стадыён, які пасля маштабнай рэканструкцыі атрымаў другое жыццё. На абнаўленне спартыўнага аб'екта было выдаткавана 1,5 мільёна рублёў. Цяпер гэта сучасны стадыён з якасным пакрыццём і тэхналагічным абсталяваннем. Урачыстае адкрыццё ператварылася ў сапраўднае свята: сімвалічны першы пас зрабілі **намеснік Прэм'ер-міністра Юрый ШУЛЕЙКА** і **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Пётр ПАРХОМЧЫК**, а першы ўдар па мячы — юны футбаліст мясцовай спартыўнай школы.




Не меншым падарункам для жыхароў стаў новы басейн, які з'явіўся ў аздараўленчым цэнтры «Энергія». Гэта сучасны двухпавярховы комплекс з басейнамі для дзяцей і дарослых, турэцкай лазняй, масажнымі кабінетамі і медпунктам. Асобную ўвагу прыцягнуў і незвычайны арт-аб'ект — велізарная крэветка, якая з'явілася ў гарадскім парку. Гэты сімвал Белаазёрска невыпадковы: у цёплых водах канала Бярозаўскай ГРЭС сапраўды жывуць крэветкі, таму амаль што двухметровая скульптура ракападобнага стала яркай і арыгінальнай візітнай карткай горада.

Свята «Дажынкі» ў Белаазёрску стала не толькі падзякай працаўнікам вёскі, але і нагодай адзначыць рэкордныя дасягненні хлебаробаў Брэсцкай вобласці. Упершыню рэгіён пераcягнуў мяжу ў 1,5 мільёна тон збожжа (без уліку грэчкі, проса, кукурузы і рапсу) — гэта на 180 тысяч тон больш, чым летась. Найлепшыя раёны па выніках жніва былі адзначаны на ўрачыстай сцэне. Пераможцам стаў Драгічынскі раён, другое месца заняў Іванаўскі, трэцяе — Столінскі. Узнагароды пераможцам уручыў старшыня Брэсцкага аблвыканкама Пётр Пархомчык.

Падчас урачыстай цырымоніі ўдзельнікаў абласных «Дажынак» віталі прадстаўнікі ўлады. Асаблівым момантам свята стала зачытванне віншавання Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, якое агучыў намеснік Прэм'ер-міністра Юрый Шулейка. «Брэсцкая вобласць па праве лічыцца адным з самых развітых аграрных рэгіёнаў краіны. Тут жывуць людзі, якія не толькі беражліва захоўваюць найлепшыя традыцыі айчыннага земляробства, але і смела ўкараняюць сучасныя тэхналогіі, паказваючы прыклад высокай культуры вытворчасці і трывалай працоўнай дысцыпліны. Настойлівасць, адказнасць, граматная арганізацыя ўсіх працэсаў дазволілі вам дасягнуць выдатных вынікаў, павялічыўшы мінулагоднія паказчыкі як па ўраджайнасці, так і па намалоту. Дзякуючы каманднаму духу і згуртаванасці палова вашых раёнаў пераадолела статысячны рубеж».

Гэтыя словы кіраўніка дзяржавы сталі галоўнай духоўнай нотаю свята, падкрэсліўшы значнасць працы аграрыяў для эканамічнай і харчовай бяспекі краіны. Тэматыку дзяржаўнай падтрымкі, тэхналагічнага развіцця і чалавечага фактару адзначыў і **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, упаўнаважаны прадстаўнік Прэзідэнта ў Брэсцкай вобласці Міхаіл РУСЫ.** «Хочацца парадавацца за тое, што сёлета Брэсцкая вобласць мае такі цудоўны хлеб — больш за 1,5 мільёна тон збожжа ўнесена ў каравай нашай краіны. Летась на абласных «Дажынках» у Мікашэвічах Прэзідэнт паставіў такую задачу. На Брэстчыне 8 раёнаў сапраўды маглі атрымаць больш за 100 тысяч тон збожжа — і яны гэта зрабілі».

Тут, у Белаазёрску, гучалі не толькі песні і словы падзякі, але і шчырая ўпэўненасць у тым, што Беларусь трымаецца на працы сваіх людзей. Брэстчына зноў паказала прыклад — і гэты прыклад натхняе, як і сам дух «Дажынак», дзе спалучаюцца праца, гонар і любоў да роднай зямлі. Падчас урачыстага ўшанавання герояў жніва старшыня Брэсцкага аблвыканкама Пётр Пархомчык адзначыў, што за годнымі вынікамі раёнаў і гаспадарак заўсёды стаяць канкрэтныя людзі — аграномы, механізатары, вадзіцелі. «Кожны на сваім месцы робіць важкі ўнёсак у агульную справу — ад зерня і каласка да закладкі збожжа ў засекі. Мы сёння па праве ўшаноўваем тых, хто з гэтай задачай справіўся выдатна», — падкрэсліў кіраўнік вобласці.

Губернатар Брэстчыны паведаміў, што дзякуючы працы і ўпартасці хлебаробаў рэгіён сёлета сабраў рэкордны ўраджай — 1,7 млн тон збожжа. «Упершыню ў гісторыі мы перасягнулі паўтарамільённую мяжу па намалоце збожжа без кукурузы і рапсу. Дадалі да леташняга выніку больш за 200 тысяч тон, а гэта намалот аднаго буйнога або некалькіх невялікіх раёнаў». Сёлета на ўборцы ўраджаю актыўна дапамагалі 97 маладзёжных экіпажаў, 133 сямейныя і 188 маладых вадзіцеляў. На хлебнай ніве разам з мужчынамі працавалі 26 дзяўчат і жанчын. Пётр Пархомчык адзначыў, што менавіта такі камандны дух, працавітасць і адданасць сваёй справе дазваляюць рэгіёну дасягаць высокіх вынікаў і ўпэўнена глядзець у будучыню.

Пасля ўрачыстай цырымоніі ўзнагароджання таксама вырашылася галоўная інтрыга: у 2026 годзе эстафету абласнога фестывалю працаўнікоў вёскі прымуць Баранавічы.

**Міхаіл ДАНІЛКОВІЧ, Святлана ЯКАЎЛЕВА, Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД, БелТА і Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

БАНК ТОРГОВЫЙ КАПИТАЛ
Закрытое акционерное общество

Наименование банка: **ЗАО «ТК Банк»**

**www.tcbank.by**

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
## 30 сентября 2025 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 30.09.2025 | 01.01.2025 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| **1** | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 4 893 | 2 782 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 3 527 | 4 372 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 152 175 | 143 094 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 2 875 | 3 342 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 47 161 | 37 125 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 33 313 | 33 313 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 5 400 | 5 491 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | - | - |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 15 834 | 17 241 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 265 178 | 246 760 |
| **16** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 15 884 | 10 915 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 17 711 | 14 000 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | - | - |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 435 | 217 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 34 030 | 25 132 |
| **25** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 160 291 | 61 651 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | 17 | 17 |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 27 000 | 25 000 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 2 867 | 2 934 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 40 973 | 132 026 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 231 148 | 221 628 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 265 178 | 246 760 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
## за 3 квартал 2025 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 30.09.2025 | 30.09.2024 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 16 512 | 12 166 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 196 | - |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 16 316 | 12 166 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 776 | 688 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 207 | 135 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 569 | 553 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (5) | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | (70) | 96 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | (801) | (669) |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 8 | 214 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 8 028 | 6 485 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 4 | - |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 9 587 | 7 213 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | - | 8 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 9 587 | 7 205 |

Председатель Правления С.Ф. Хайновский

Главный бухгалтер Н.А. Тиванова

Дата подписания: 02 октября 2025 г.

*Лицензия на осуществление банковской деятельности, выданная Национальным банком Республики Беларусь, № 30 от 15.05.2025, БИК 153001333, УНП 807000163.*

# УКЛАДАННІ Ў БУДУЧЫНЮ

## Мінэканомікі: у краіне створаны інструменты для ўстойлівага росту інвестыцыйнай актыўнасці на месцах

**Пра гэта заявіў першы намеснік міністра эканомікі Іван Вежнавец на пасяджэнні экспертна-кансультатыўнага савета пры Савеце Рэспублікі пад кіраўніцтвам спікера верхняй палаты парламента Наталлі Качанавай, паведамілі ў прэс-службе эканамічнага ведамства.**



Паводле слоў першага намесніка міністра, у Беларусі сфарміравана дзейсная сістэма падтрымкі вытворчага бізнесу: ад ільгот і прэферэнцый да даступнага фінансавання. Гэта дазваляе мадэрнізаваць дзеючыя прадпрыемствы і запускаць новыя, ствараць працоўныя месцы, умацоўваючы эканамічную ўстойлівасць рэгіёнаў.

— Рэалізацыя ініцыятывы кіраўніка дзяржавы «Адзін раён — адзін праект» ужо прынесла адчувальныя вынікі: завершаны 91 праект у 79 раёнах, створана 4,3 тысячы працоўных месцаў, — паведаміў Іван Вежнавец.

Паводле яго слоў, да канца года плануецца рэалізаваць яшчэ каля 60 праектаў, што дасць дадаткова 2,6 тысячы працоўных месцаў.

— Астатнія — наш стратэгічны рэзерв на наступную пяцігодку, — адзначыў спікер.

Таксама ён распавёў аб запуску новай «Рэгіянальнай ініцыятывы»:

— Ужо сфарміраваны партфель з 70 праектаў на суму звыш 500 мільёнаў рублёў. Сёння мы актыўна працуем над паляпшэннем умоў фінансавання бізнес-ідэй, якія ўдзельнічаюць у гэтай ініцыятыве. Таксама ў наступным годзе плануецца запуск трох новых крэдытных прадуктаў, накіраваных на выкананне задач пяцігодкі: «Моцныя рэгіёны», «Тэхналагічная самадастатковасць» і «Турыстычны патэнцыял».

Першы намеснік кіраўніка эканамічнага ведамства таксама нагадаў, што абноўлены Закон «Аб інвестыцыях» прапануе гнуткія механізмы падтрымкі.

— Для буйных праектаў — інвестыцыйныя і спецыяльныя інвестдагаворы з пашыраным пакетам ільгот і магчымасцю дзяржзакупкі прадукцыі. Ужо заключаны тры такія дагаворы на суму 2,6 мільярда рублёў, — прывёў лічбы ён. — Для рэгіянальных ініцыятыў — базавы пакет ільгот у рамках прэферэнцыйнага інвестпраекта. Рэгіянальнымі ўладамі прынята 19 рашэнняў на агульную суму каля 1,2 мільярда рублёў.

Іван Вежнавец звярнуў увагу на асаблівыя ўмовы — для інавацыйных праектаў з высокім патэнцыялам імпартазамяшчэння і накіраваных на забеспячэнне тэхналагічнай бяспекі.

Акрамя гэтага, нагадаў ён, у краіне эфектыўна працуюць і іншыя прэферэнцыйныя рэжымы: у СЭЗ, індустрыяльным парку «Вялікі камень», ПВТ і тэхнапарках.

— Усе гэтыя меры — не проста падтрымка бізнесу. Гэта інвестыцыі ў будучыню рэгіёнаў і краіны ў цэлым, — рэзюмаваў Іван Вежнавец.

# З ПРЫПЫНКАМ У ПАРКУ

## Стартуе будаўніцтва хуткаснай чыгункі ў Нацыянальны аэрапорт Мінск

**Пачынаецца рэалізацыя аднаго з самых чаканых інфраструктурных праектаў — хуткасных пасажырскіх чыгуначных зносін па маршруце Мінск — Гарадзішча — індустрыяльны парк «Вялікі камень» — Нацыянальны аэрапорт Мінск, распавялі ў адміністрацыі парку.**

Падрыхтоўчыя работы плануецца пачаць у 2025 годзе.

Згодна з праектам, чыгунка пройдзе па існуючым маршруце ад станцыі Мінск-Пасажырскі праз Калодзішчы да станцыі Гарадзішча, пасля якой будзе пракладзена каля 18 кіламетраў новых чыгуначных шляхоў у напрамку аэрапорта.

Агульная працягласць маршруту складзе 41,8 кіламетра, а час у шляху — менш за 30 хвілін.

Інфраструктура на гэтым участку будзе ствараца практычна з нуля, таму рэалізацыя праекта разлічана на некалькі гадоў. Тэрміны рэалізацыі — да 2028–2029 гадоў, калі пойдуць першыя саставы.

— Праект хуткасных зносін створыць сучасную транспартную сувязь паміж сталіцай, індустрыяльным паркам «Вялікі камень» і Нацыянальным аэрапортам Мінск, спрыяючы далейшаму развіццю парка як ключавога лагістычнага і інвестыцыйнага цэнтра рэгіёна, — падкрэслілі ў адміністрацыі парка.



# ПРА ЯКАСЦЬ І НЕ ТОЛЬКІ

## Дзяржстандарт правядзе адзіны дзень кансультавання 8 кастрычніка




**Мерапрыемства такога фармату ініцыіруецца ўпершыню і праводзіцца ў рамках месячніка стандартызацыі, прысвечанага прафесійнаму святу — Дню стандартызацыі і сусветнаму дню стандартызацыі, а таксама 100-годдзю ўтварэння органаў дзяржаўнай стандартызацыі, паведамілі ў прэс-службе ведамства.**

Тут патлумачылі, што 8 кастрычніка з 10.00 да 16.00 любы суб'ект гаспадарання або грамадзянін зможа звярнуцца і атрымаць бясплатную кансультацыю па актуальных пытаннях, якія ўзніклі ў практычнай дзейнасці і датычацца такіх сфер, як тэхнічнае нармаванне і стандартызацыя; забеспячэнне адзінства вымярэнняў; пацвярджэнне адпаведнасці; акрэдытацыя; выпрабаванні; сістэмы менеджмент; конкурсны рух у галіне якасці; дзяржаўны нагляд і дзяржаўны метралагічны нагляд; адукацыйная дзейнасць.

У ведамстве дадалі, што ўсяго ў адзіным дні кансультавання прымаюць удзел 24 арганізацыі Дзяржстандарта. Гэта інстытуты, цэнтры стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі, абласныя інспекцыі Дзяржстандарта.

Звярнуцца ў іх па кансультацыі можна як вочна, так і па тэлефоне ў пазначаны вышэй час. Падрабязнасці — на сайце Дзяржстандарта.

— Правядзенне Адзінага дня кансультавання будзе спрыяць прававому інфармаванню грамадзян і арганізацый у сферы кампетэнцый Дзяржстандарта, удасканаленню зваротнай сувязі, выяўленню праблемных пытанняў і іх аператыўнаму вырашэнню, — выказалі ўпэўненасць у ведамстве.

# ПАБУДУЕМ — БУДЗЕМ ЖЫЦЬ

## Якім планіроўкам і дызайну аддаюць перавагу навасёлы?

Што выклікае водгук у душы сучасных пакупнікоў «квадратных метраў»? На нядаўняй Міжнароднай архітэктурна-будаўнічай выстаўцы «Будэкспа-2025» менавіта пра гэта мы спыталіся ў экспертаў будаўнічай галіны.

### «ГНУТКАЯ ПРАСТОРА» І «КАРЫСНЫЯ МЕТРЫ»

— Апошнім часам папулярнае сумяшчэнне кухні і гасцінай, — расказвае **вядучы інжынер тэхнічнага аддзела ААТ «МАПІД» Ганна НІКІЦЕНКА.** — Напрыклад, такія рашэнні прадугледжаны ў пасёлку «Сонечны», які ўзводзіцца за МКАДам насупраць ГЦ «Экспабел». Тут аб'яднаны кухня і гасціная, а астатнія пакоі выдзелены ў асобныя памяшканні. Такі падыход зручны пры наведванні гасцей: гаспадыні не даводзіцца бегаць са стравамі з кухні ў гасцінную. Акрамя таго, сёння далёка не ўсе гатуюць ежу «з нуля». Ёсць катэгорыя сучасных гараджан, пераважна маладых, якія аддаюць перавагу гатоваму харчаванню або паўфабрыкатам з серыі «толькі разагрэць». І вось менавіта для іх сумяшчэнне кухні і гасцінай — аптымальны варыянт.

Яшчэ адно запатрабаванае планіровачнае рашэнне — схаваныя сістэмы (перагародкі, якія можна скласці па жаданні), распавялі эксперты. Карыстаюцца попытам так званыя адкрытыя планіроўкі і «гнуткая прастора».

— Калі кватэра вялікая (у «Сонечным», калі ўжо яго бяром у якасці прыкладу, такія планіроўкі ў трохпакаёвых кватэрах), пакупнік нярэдка хоча мець два санвузлы, — працягвае суразмоўніца.

Санвузел можа быць сумешчаным з ваннай, але ў такім выпадку гэта павінна быць досыць прасторнае і стыльнае памяшканне. Улічваючы кошт квадратнага метра, трэнд апошняга дзесяцігоддзя — «функцыянальныя планіроўкі»: усе памяшканні ў кватэры павінны выкарыстоўвацца на 100 %, па максімуме. Тэндэнцыя агульнаеўрапейская, і аб'яднанне кухні і гасцінай, мабыць, — яго самая яркая праява. Калідор, абавязковы ў класічных савецкіх планіроўках, адсутнічае: яго месца заняў хол.

— Сучасны пакупнік хоча адразу, зайшоўшы ў пустую кватэру з голымі сценамі, разумець, дзе будзе ўбудаваная шафа-купэ, дзе стаяць тыя ж крэслы і куды ўстане ложак, — тлумачаць эксперты. — Акрамя таго, сёння для спажыўца важна наяўнасць кладоўкі. Яшчэ варта адзначыць новыя функцыі лоджый.

Балкон ці лоджыя цяпер не «дадатак» да жылых метраў: іх абсталёўваюць пад рабочы кабінет, летні дзіцячы пакой, міні-спартзалу, ператвараюць у аранжарэю.

Яшчэ адна тэндэнцыя, якая датычыцца ўжо не асобных кватэр, а «сумеснага пражывання» з суседзямі, — мода на камфортныя і, галоўнае, бяспечныя «грамадскія прасторы», распавяла суразмоўца:

— Напрыклад, у гэтым ключы — рашэнні па парковачных месцах у новай забудове. Яны знаходзяцца ўнізе (за кожнай кватэрай у новых забудовах часта замацавана машына-месца), а вышэй, на стылабаце (гэта ніжняя частка будынка, дадатковая апора для вышынных дамоў), знаходзіцца дзіцячая пляцоўка і зона адпачынку для дарослых. Тым самым дасягаецца бяспека: машыны не маюць туды доступу. А з паркінга можна на ліфце падняцца ў сваю кватэру.



### ХУТЧЭЙ І ТАННЕЙ

Хутка ўзведзеныя будынкі — адзін з трэндаў у будаўніцтве, які сёння набірае папулярнасць, расказалі эксперты.

— Вядома, гэта не вышынныя будынкі, а максімум 4-5 паверхаў, — тлумачыць **вядучы спецыяліст дзяржаўнага вытворчага аб'яднання «Мінскбуд» Максім КУШНЯРЭВІЧ.** — Сёння такая тэхналогія актыўна ўкараняецца ў Расіі: менавіта так забудоўваюць Маскву, Санкт-Пецярбург, іншыя гарады. У нас па гэтай тэхналогіі ўжо ўзведзены 4 карпусы інфекцыйнай бальніцы на Даўгінаўскім тракце.

Але наогул тэхналогія зручная ў першую чаргу для індывідуальнага будаўніцтва, адзначае суразмоўца: для прыватнай або дачнай забудовы.

— Яе перавагі ў выкананні лёгкіх сталёвых тонкасценных канструкцый (ЛСТК) — хуткасць узвядзення, даўгавечнасць і патаненне квадратнага метра, — распавядае ён. — Вы пабудавалі каркас, а потым у залежнасці ад бюджэту вырашаеце, якімі матэрыяламі яго абшыць, больш укласці ў дах або ў сценавое аздабленне. Хутка ўзведзеныя будынкі і збудаванні на аснове ЛСТК — наша беларуская вытворчасць. Размяшчаецца яна ў тэхнапарку ў Мінску. Каркас будынка — досыць складаная інавацыйная сістэма, свайго роду шматслаёвы «піражок з начынкай»: канструкцыя атрымліваецца лёгкай, не патрабуе моцнага падмурка, дом практычна не дае ўсадкі.

### ЦІ АЦАНІЛІ НОЎ-ХАУ СПАЖЫЎЦЫ?

— Сёння людзі пачалі рухацца ў гэты бок, — кажа прадстаўнік «Мінскбуда». — На аснове ЛСТК ужо досыць запатрабаваныя прыватная катэджная і дачная забудовы.

«Хуткую» тэхналогію каркасных будынкаў з дрэва спажывец, зрэшты, ужо ацаніў, распавялі на прыватным прадпрыемстве Frame House. Самы хадавы «прадукт» у такім выкананні сёння — лазні.

— Кошт лазні залежыць ад пажаданняў заказчыка — памераў, тыпу і матэрыялу печы... На ўзвядзенне такой лазні хопіць тыдня або двух, — растлумачыў суразмоўца.

Каркасны дом спецыялісты пабудуюць за два месяцы, дадаў ён. Найбольш часта выбіраюць варыянт у 60 кв. м: дзве спальні і (менавіта так!) гасцёўня, сумешчаная з кухняй.

— Такі дом можа быць прыдатны нават для круглагадовага пражывання: пытанне рэгулюецца таўшчынёй уцяплення, — адзначыў суразмоўца.

### ПРЫГАЖОСЦЬ У ДРОБЯЗЯХ

Што кажуць прафесіяналы аб сучасных перавагах спажыўцоў у дызайне? Дызайнеры сыходзяцца ў тым, што «стэрыльны» мінімалізм, як і стыль хай-тэк, папулярныя яшчэ некалькі гадоў таму, сёння саступілі месца больш класічным інтэр'ерным рашэнням. Спакойны і зразумелы дызайн не выкліча маральнай стомленасці праз некалькі месяцаў, будзе радаваць доўгія гады.

Папулярны ў інтэр'ерным дызайне ў 2024—2025 гадах чорны колер у нашых краях, дзе неба шэрае і сонечнае святло ў дэфіцыце мінімум паўгода, неяк не прыжыўся. За адным выключэннем: афармленне ванных пакояў.

— Кожнае дызайнерскае рашэнне так ці інакш знаходзіць свайго прыхільніка, — кажа **супрацоўніца гандлёвага ўнітарнага прадпрыемства «Керамін-сталіца Інвест» Галіна АЎДЗЕЕВА.** — Але ў большай ступені сучаснаму пакупніку блізкія натуральныя тэкстуры — каменя, дрэва. Што датычыцца інтэр'ера ванных, сёння асабліва папулярны цёмныя колеры пліткі.

А яшчэ дызайнеры адзначаюць адраджэнне цікавасці да старых добрых паркетных падлог у процівагу рознага роду сучасным пакрыццям. Зразумела, што гэта зусім не бюджэтны варыянт. І ўсё ж вытворцы паркета ў такім «павароце» нічога дзіўнага не бачаць.

— Натуральны паркет — гэта цяпло і ўтульнасць, ён «дыхае», — кажа **кіраўнік філіяла «Паркетны завод Смалявічы» Аляксандр КАСПЯРЧУК.**

Што датычыцца ўкладкі, то замест знаёмай з дзяцінства «ялінкі» ў жылым інтэр'еры сёння людзям падабаецца так званая «палубная» выкладка (гэта значыць, прамая кладка дошчачак).

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Агролизинг», 220005, г. Минск, ул. Красная, 13-31, тел. +37517-242-13-81 |
| **Предмет аукциона** | |
| **Торговое помещение** 1672,1 кв. м, 610/D-47661. Адрес: **г. Борисов, ул. Строителей, д. 28, пом. 5** | |
| **Начальная цена лота с НДС 20 % – 2 122 286,00 бел. руб.** | |
| **Условия по лоту:** в случае признания победителем аукциона либо единственным участником, согласившимся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, хозяйствующего субъекта до совершения сделки может потребоваться согласие антимонопольного органа (МАРТ) на экономическую концентрацию | |
| **Обременения по лоту:** площади частично сданы в аренду, находятся в залоге у ОАО «Банк развития Республики Беларусь». С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 30 (тридцати)** дней после проведения аукциона, а в случае необходимости получения согласия антимонопольного органа на экономическую концентрацию – **90 (девяносто)** дней | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты объекта, такая оплата должна быть произведена **в течение 30 (тридцати)** дней после заключения договора купли-продажи | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | |
| Предыдущее извещение по лоту опубликовано в газете «Звязда» от 02.09.2025 | |
| **Аукцион состоится 06.11.2025 в 13.00 по адресу: г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 512. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 04.11.2025 до 17.00 по указанному адресу** | |
| **Тел.: +375 17 310-36-37; +375 29-154-34-35. E-mail: auction@cpo.by** | |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»** (организатор аукциона) по поручению **открытого акционерного общества «Зазерки»** (продавец) проводит открытый аукцион

ПО ПРОДАЖЕ **ЖИЛОГО ДОМА с инв. № 602/С-245566**

*(составные части и принадлежности: сарай (2 шт.), пристройка)* **общей площадью 33,3 м², расположенного на земельном участке с кадастровым номером 624484805301000140 площадью 0,2579 га по адресу: Минская обл., Пуховичский р-н, Пережирский с/с, д. Залесье, ул. Солнечная, д. 18А.**

Начальная цена без НДС – **4 477,09** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **447,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **10.11.2025** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **05.11.2025** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320**.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11, тел. для осмотра: (8029) 385-53-16, (801713) 92-5-16.**

УНП 600116032

**ЗАО «Центр промышленной оценки»** (УНП 191021390) – проводит четвертые повторные торги в форме открытого аукциона по продаже **зданий и сооружений** (13 лотов) и вторые повторные торги в форме открытого аукциона по продаже **зданий и сооружений** (16 лотов), расположенных по адресу: **Гомельская обл., Мозырский р-н, Михалковский с/с, 15**, принадлежащих ОАО «Мозырский спиртоводочный завод» (Антикризисный управляющий – ООО «СтанИБор» (УНП 491343813) – производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 118-10Б/2016).

**Аукцион состоится 22.10.2025 в 13.00.**

Заявки принимаются с 9.00 07.10.2025 по 21.10.2025 до 17.00.

С порядком оформления участия в аукционе, общими правилами проведения можно ознакомиться на www.bankrot.gov.by либо на сайте организатора аукциона www.cpo.by и по тел. +375 29 805 93 30 (Светлана Павловна); +375 29 8717025 (Валерий Петрович).

**Аукцион и прием заявок проходит по адресу: г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 512.**

# ГАЛОЎНЫ ПРЫНЦЫП — БЯСПЕКА

## Як працуюць новаўвядзенні для карыстальнікаў СПМ

З 1 верасня ўступіла ў сілу новая рэдакцыя Правілаў дарожнага руху, якая мяняе падыходы да вызначэння статусу сродкаў персанальнай мабільнасці (СПМ). Пра галоўныя змены расказаў намеснік начальніка ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Дзяніс ЛІВАНОВІЧ.



### РЭГІСТРАЦЫЯ, ПРАВА, ШЛЕМ

Самая прынцыповая навіна — карыстальнікі СПМ больш не лічацца пешаходамі. Цяпер яны прыраўноўваюцца да веласіпедыстаў. «Тэрмін «сродак персанальнай мабільнасці» таксама змяніўся. Гэта аднаколавы альбо шматколавы транспартны сродак з канструктыўнай хуткасцю не больш за 25 км/г, прызначаны для перамяшчэння толькі аднаго чалавека з дапамогай выкарыстання электрарухавіка», — адзначыў Дзяніс Ліванові́ч.

Ключавы крытэрый — хуткасць. Калі транспарт можа разганяцца больш за 25 км/г, ён ужо адносіцца да катэгорыі мапедаў ці матацыклаў. У такім выпадку патрабуюцца катэгорыі на права кіравання, рэгістрацыя, страхаванне, а таксама наяўнасць шлема. Для такіх сродкаў дзейнічае спрошчаны парадак рэгістрацыі да 1 верасня 2026 года.

### АБАВЯЗКІ І АДКАЗНАСЦЬ

Адным з найбольш прыкметных новаўвядзенняў стала патрабаванне спешвацца на пешаходных пераходах.

**Выключэнні магчымы толькі ў выпадках:**

— руху на скрыжаванні па веласіпедным пераездзе або не далей чым 1 м ад правага краю праезнай часткі дарогі;

— калі па пешаходным пераходзе або велапераездзе рух рэгулюецца веласвятлафорамі або спецыяльнымі таблічкамі;

— пры перасячэнні праезных частак па лініі тратуараў або абочын, саступаючы дарогу іншым транспартным сродкам (напрыклад, калі тратуар перасякаецца з выездамі з прылеглых дваровых тэрыторый).

«Аднак калі ёсць «зебра» ці сумешчаны пераход з велапераездам і няма веласвятлафора ці таблічкі, то абавязкова трэба спешвацца», — удакладніў прадстаўнік ДАІ.

Правілы цяпер падрабязней рэгламентуюць хуткасны рэжым: па веладарожках можна ехаць з хуткасцю не больш за 25 км/г, а па тратуарах — не больш за 10 км/г. Пры гэтым каб ехаць па тратуары, маса СПМ павінна быць не больш чым 35 кг. Таксама з'явілася новая норма: забарона руху на СПМ у пешаходных зонах.

**За парушэнні прадугледжана адміністрацыйная адказнасць:**

- ад 1 да 3 базавых велічынь — за агульнае парушэнне;
- ад 3 да 5 базавых велічынь — калі парушэнне здзейснена ў стане алкагольнага ап'янення;
- ад 3 да 8 базавых велічынь — калі дзеянні стварылі аварыйную абстаноўку.

### СТАЎКА НА ПРАФІЛАКТЫКУ

Пры гэтым, як паведаміў Дзяніс Ліванові́ч, ДАІ ў першую чаргу робіць стаўку на прафілактыку і тлумачальную работу, а не на штрафаванне, бо норма аб хуткасці прызначана для павышэння свядомасці карыстальнікаў. «У выпадку ДТЗ, калі ёсць відэафіксацыя і відавочнае перавышэнне хуткасці, дзеянням будзе дадзена юрыдычная ацэнка. Але галоўнае — гэта прафілактыка і адказнасць саміх грамадзян», — растлумачыў прадстаўнік Дзяржаўтаінспекцыі.

Асобную ўвагу ДАІ звяртае на дзяцей, якія карыстаюцца электрасамакатамі. «Бацькам трэба самім абнавіць у памяці правілы дарожнага руху і растлумачыць іх дзецям. Варта кантраляваць, якім самакатам карыстаецца дзіця, дзе і ў якой кампаніі, бо нават стандартны можна «разблакіраваць» на хуткасць да 50 км/г, што вельмі небяспечна. Таксама нагадваем, што дзецям, якія не дасягнулі 14 гадоў, дазваляецца кіраваць сродкамі персанальнай мабільнасці толькі на тэрыторыі жылых зон», — падкрэсліў намеснік начальніка ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама.

### ШТО КАЖУЦЬ КАРЫСТАЛЬНІКІ?

Новыя правілы дарожнага руху выклікалі актыўнае абмеркаванне ў тых, хто найбольш часта карыстаецца СПМ. Размовы з самакатчыкамі і веласіпедыстамі паказалі: людзі гатовыя да змен, але, па іх меркаваннях, пакуль ёсць над чым працаваць. Над тым жа спешваннем, напрыклад.

— Можа, гэта як-небудзь адрэгуляваць? Проста пакуль я даеду да Камароўкі, трэба спыняцца і спешвацца восем разоў... — падзялілася веласіпедыстка Вікторыя.

— Для ўласнай бяспекі лепш спешвацца. Гэта галоўны прынцып, на якім трымаюцца ўсе новаўвядзенні, — растлумачыў ёй інспектар ДАІ.

Такія дыялогі — звычайная справа. Для адных часткі спыненні выглядаюць нязручнымі, для іншых гэта натуральная неабходнасць дзеля бяспекі. Таксама сваімі думкамі падзялілася самакатчыца Дар'я: «З правіламі азнаёмлена. Спецыяльна пыталася ў інспектара, у якіх выпадках трэба абавязкова спешвацца. Правілы зручныя, думаю, так усім будзе лягчэй».

Яшчэ адзін карыстальнік адзначае: «Рухацца мы пачнём больш арганізавана. У выніку гэта толькі плюс для ўсіх удзельнікаў дарожнага руху».





**Міхаіл ДАНІЛКОВІЧ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**


**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» _20 октября 2025 г._ проводит открытый аукцион по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности**

**Вид аукциона:** открытый (на повышение начальной цены). **Предмет аукциона:** право заключения договора аренды.
**Арендодатель имущества и организатор аукциона:** государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 320, тел. +375 (17) 516 80 64).
**Порядок проведения аукциона** определен Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 (далее – Положение).

| № лота | Местонахождение имущества | Площадь (кв. м) | Размер арендной платы в БАВ* | Коэфф. спроса | Начальная цена права заключения договора аренды имущества / сумма задатка (руб.) | Целевое использование имущества | Наименование имущества, его характеристика, необходимые условия аренды и иные сведения |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 1 | г. Минск, ул. Промышленная, 9/2 (в здании специализированном складов с инв. № 500/С-5953, общ. пл. 202,8 кв. м) | 45,7 | 27,19/ **510,36 бел. руб.** | 1,7 | 214,45 | Склад и иные цели, возможные на данных площадях | Склад 14. Отдельный вход. Имеется электроснабжение. Требуется: ремонт, установка приборов учета электроэнергии (тех. учет). Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 2 | г. Минск, ул. Промышленная, 9, здание проходной с инв. № 500/С-5951, общ. пл. 41,2 кв. м | 41,2 | 24,51/ **460,05 бел. руб.** | 1,7 | 193,33 | Любые цели, возможные на данных площадях | Здание проходной полностью. Имеется электроснабжение. Требуется: ремонт, установка приборов учета электроэнергии (тех. учет). Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 3 | г. Минск, ул. Промышленная, 9/4, здание нежилое с инв. № 500/С-56343, общ. пл. 24,2 кв. м | 24,2 | 16,09/ **302,01 бел. руб.** | 1,9 | 113,56 | Любые цели, возможные на данных площадях | Капитальное строение полностью. Имеется электроснабжение. Требуется: ремонт, установка приборов учета электроэнергии (тех. учет). Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 4 | г. Минск, ул. Масюковщина, 30 Автомобильная стоянка с инв. № 500/С-67662, общ. пл. 10 879,2 кв. м (составные части и принадлежности: площадка под автостоянку, тротуар, ограждение, здание КПП, туалет) | 10 879,2<br>36<br>3,1 | **19 756,95 бел. руб.** | -<br>3<br>(для КПП и туалета) | 4930,04 | Открытая площадка для хранения | Составные части и принадлежности: площадка под автостоянку (10 879,2 кв. м), тротуар, ограждение, туалет (3,1 кв. м), здание КПП (36 кв. м) |

** Без учета коэффициента для отдельных видов деятельности (устанавливается при наличии оснований).*
** Базовая арендная величина составляет 18,77 бел. руб., размер базовой арендной величины ежегодно устанавливается Советом Министров Республики Беларусь с учетом изменения индекса потребительских цен за предыдущий год по отношению к предшествующему и применяется с 1 апреля года, в котором он установлен.*

В отношении лотов №№ 1–4 торги являются повторными.
Техническое улучшение помещений, а также текущий ремонт осуществляются за счет Арендатора и последующей компенсации не подлежат.

**Аукцион состоится 20 октября 2025 г. в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 (актовый зал).**
**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 320, по 16 октября 2025 г. включительно в рабочие дни с 08.30 до 17.00.**
**Телефоны для справок: отдел аукционов — +375 (17) 516 80 64, инженер по обслуживанию помещений – +375 (17) 516 80 63.**
**Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.rlt.by; Минского областного исполнительного комитета – www.minsk-region.gov.by; Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – www.gki.gov.by (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»).**

# СЕКУНДА НА ВАГУ ЗОЛАТА

## Складнікі поспеху ратавальнікаў



**Днём і ноччу ратавальнікі прыходзяць на дапамогу людзям, якія трапілі ў бяду. Ліквідуючы надзвычайныя сітуацыі як прыроднага, так і тэхнагеннага характару, яны на ўвесь свет заявілі: няма тых задач, якія не былі б па сілах супрацоўнікам МНС Беларусі. За высокім аўтарытэтам на міжнароднай арэне і бездакорнай павагай да людзей гэтай прафесіі ўнутры краіны — добрасумленнае выкананне пастаўленых задач, аснашчэнне падраздзяленняў сучаснай пажарнай аварыйна-ратавальнай тэхнікай, тэхнічнымі сродкамі, абсталяваннем і экіпіроўкай, стварэнне камфортных умоў працы. У сукупнасці ўсё гэта ўплывае на якасць аказання дапамогі — а значыць, на захаванне чалавечых жыццяў.**

У гэтым пераканаліся карэспандэнты «Звязды», якія пабывалі ў пажарнай аварыйна-ратавальнай часці № 42 г. Мінска. Сучаснае пажарнае дэпо, якое знаходзіцца ў новым сталічным мікрараёне «Паўночны бераг», забяспечвае бяспеку звыш 130 тысяч жыхароў.

***За 2020 — 2024 гады ў падраздзяленнях МНС уведзены ў эксплуатацыю 73 аб'екты. З іх — 68 будынкаў пажарных часцей (дэпо, пастоў), 5 будынкаў грамадскага і вытворчага прызначэння.***

### ПЕРШЫ ФАКТАР — УМОВЫ ПРАЦЫ

Дэпо ўяўляе сабой двухпавярховы корпус для спецыялістаў і гараж на пяць пажарных машын. На тэрыторыі абсталяваны спартыўная пляцоўка, стадыён і спецыяльная вежа для трэніровак, якія прызначаны для падтрымання высокай баявой гатоўнасці і адпрацоўкі шматлікіх сцэнарыяў надзвычайных сітуацый. У распараджэнні ратавальнікаў — утульны пакой для адпачынку, сталовая з усёй неабходнай кухоннай тэхнікай, пакой псіхалагічнай разгрузкі, трэнажорная зала. Камфортныя ўмовы працы — залог якаснага выканання пастаўленых задач.

«Асноўная задача — ратаваць людзей, — адзначае **старшы інструктар-ратавальнік Андрэй КУХТА.** — За гэтым стаіць вельмі многае: баявая і псіхалагічная падрыхтоўка, маральны стан, веды, якія ты набываеш падчас практычнай дзейнасці. Гэта і маёмасць, якая заўсёды павінна быць у баявой гатоўнасці, і добрая матэрыяльная база».

Па меркаванні Андрэя і яго калег, камфортнае знаходжанне ў дэпо ўплывае на гатоўнасць выканання любых пастаўленых задач, накіраваных на ліквідацыю надзвычайных сітуацый. Які б сігнал аб дапамозе ні паступіў — кожны гатовы выехаць на месца здарэння і аказаць дапамогу. На выклік супрацоўнікі МНС павінны сабрацца за хвіліну днём і за паўтары хвіліны ноччу. «Кожная секунда — на вагу золата, ад яе залежыць жыццё чалавека», — звяртае ўвагу **кіроўца аўтацыстэрны Сяргей ГАРБУТОЎ.**

### ДРУГІ ФАКТАР — САМАПАДРЫХТОЎКА

**Начальнік пажарнай аварыйна-ратавальнай часці № 42 Цэнтральнага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Аляксей КУРЦЮГОЎ** расказвае, што ўвесь час вучацца, удасканальваюць сваё майстэрства і дзеючыя, нават вельмі вопытныя ратавальнікі. Каб яшчэ больш аператыўна і якасна аказваць дапамогу, пры заступленні на дзяжурства яны не сядзяць, склаўшы рукі, ад выкліку да выкліку. Ёсць расклад баявой падрыхтоўкі, згодна з якім плануецца распарадак дня. Для супрацоўнікаў МНС праводзяцца заняткі па арганізацыі баявых разгортванняў, адпрацоўцы навыкаў работы з лесвіцамі, спецыфіцы аказання дапамогі ў сродках індывідуальнай абароны, у альпінісцкім абмундзіраванні і інш. Ратавальнікі пастаянна аналізуюць свае дзеянні падчас ліквідацыі надзвычайных сітуацый, каб удасканаліць работу ў далейшым.

«Час паміж выклікамі выкарыстоўваем і для тэхнічнага абслугоўвання пажарнай тэхнікі, — адзначае Сяргей Гарбутоў. — Тое, што можам зрабіць самі, робім. Калі гэта не ў нашай кампетэнцыі, накіроўваем аўтамабіль у вытворча-тэхнічны цэнтр, які знаходзіцца на балансе ведамства».

### ТРЭЦІ ФАКТАР — АРГАНІЗАЦЫЯ РАТАВАЛЬНАЙ АПЕРАЦЫІ

Поспех любой ратавальнай аперацыі пачынаецца з прыняцця паведамлення аб тым, што здарылася. Апаратная пункта сувязі — «крывяносная сістэма» сталічнай пажарнай аварыйна-ратавальнай часці № 42: менавіта сюды сцякаецца ўся інфармацыя аб надзвычайных сітуацыях у раёне адказнасці, якую перадаюць са службы «101». Радыётэлефаніст, які прымае званкі, зыходзячы з маштабу і абставін здарэння, вырашае, якую колькасць тэхнікі неабходна адправіць па ўказаным адрасе, колькі спецыялістаў будуць задзейнічаны ў ратавальнай аперацыі і ў якім абмундзіраванні павінны быць супрацоўнікі МНС. За лічаныя хвіліны варта прыняць рашэнне, ад якога залежыць якасць аказанай дапамогі.

***За перыяд з 2021 па 2024 год на ўзбраенне органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях паступіла 742 адзінкі транспартных сродкаў, у тым ліку 236 адзінак пажарных аўтацыстэрнаў і 51 адзінка вышыннай тэхнікі. У 2023 годзе ў рамках рэалізацыі даручэння Прэзідэнта Беларусі набыты і пастаўлены на ўзбраенне ДААСУ «Авіяцыя» два верталёты Мі-17.***

«Асноўная колькасць выклікаў звязана з дапамогай насельніцтву: гэта і вызваленне людзей з ліфта, калодзежа, з пашкоджанага ў аварыі аўтамабіля, — расказвае **радыётэлефаніст Надзея ВЯРЭНІЧ**. — Рэагуем на спрацаванасць сістэмы перадачы паведамленняў аб надзвычайных сітуацыях «Маланка». Бывае, нехта пакурыў — датчык спрацаваў, або гаспадар спаліў на пліце каструлю. Дзякуючы сістэме ўдалося выратаваць шмат людзей».

### ЧАЦВЁРТЫ ФАКТАР — НАДЗЕЙНАЕ АБМУНДЗІРАВАННЕ

Замежныя калегі па-добраму зайздросцяць абмундзіраванню беларускіх ратавальнікаў: яго якасць і надзейнасць былі не раз правераны падчас тэхнагенных і прыродных катастроф. Сродкі пажаратушэння, рыштунак, сродкі аховы ратавальнікаў-пажарных, апараты для абароны органаў дыхання і адзенне нашых спецыялістаў — усё айчыннай вытворчасці.

«Камплект адзення ўключае ў сябе крагі (пальчаткі), куртку, штаны, боты, каску, падкаснік, пояс з карабінам і тапаром, — расказвае **старшы інструктар-ратавальнік Яўген РУБАЦКІ.** — Боты з металічнымі ўстаўкамі, якія абараняюць ад выпадковых падзенняў грузаў на ногі. Баявое адзенне не прапускае ваду, устойлівае да ўздзеяння адкрытага полымя і тэмпературы да 300 °С, а таксама да кантакту з прадметамі, нагрэтымі да 400 °С. Вага баявога адзення ратавальніка складае менш за 4 кг, што на 20 % лягчэй за замежныя аналагі».

У залежнасці ад умоў выканання аварыйна-ратавальных работ прадугледжаны розныя варыянты касцюмаў.

### ПЯТЫ ФАКТАР — ШМАТФУНКЦЫЯНАЛЬНАЯ ТЭХНІКА

У гаражы пажарнай часці — новая, сучасная тэхніка, якая выкарыстоўваецца падраздзяленнямі МНС для вырашэння задач па прызначэнні. Практычна ўся — беларуская. Айчыннае прадпрыемства па вытворчасці пажарных машын, спецыяльнай і спецыялізаванай тэхнікі — ТАА «ПАЖСНАБ» — зарэкамендавала сябе і за мяжой. Сярод апошніх распрацовак — аўталесвіца з вышынёй уздыму 52 метры, якая дазваляе ліквідаваць надзвычайныя сітуацыі і ратаваць пацярпелых з верхніх паверхаў 17-павярховых будынкаў. Дзякуючы падтрымцы кіраўніка дзяржавы з 2025 па 2027 год на ўзбраенне органаў і падраздзяленняў МНС паступіць 17 такіх пажарных аўталесвіц.

Старшы інструктар-ратавальнік Андрэй Кухта дэманструе магчымасці аўтамабіля хуткага рэагавання. «У адной машыне, акрамя таго, што яна ўтрымлівае ёмістасць з вадой, вялікая колькасць шматлікага інструмента, — звяртае ўвагу ён. — Ёсць камбінаваныя інструменты, якія выкарыстоўваюцца пры розных сітуацыях».

Адным словам, да якасці ў ратавальнага ведамства Беларусі асаблівыя адносіны. Яна тут ва ўсім — пачынаючы ад тэхнікі і абсталявання, заканчваючы прафесійнай ацэнкай надзвычайнай сітуацыі і добрасумленным стаўленнем да выканання задач. За ўсім гэтым — бяспека, жыццё і здароўе людзей.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390. (www.cpo.by) |
| **Продавец** | ОАО «НКФО «Белинкасгрупп», 220028, г. Минск, ул. Либаво-Роменская, 23. УНП 807000270 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191 224 638. (www.ipmtorgi.by) |

**Предмет электронного аукциона: грузовые специальные автомобили (б/у). Месторасположение: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 69**

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, руб. |
|---|---|---|
| **1.** | Volkswagen Caddy RYCAR 294544, рег. знак АР 9587-7, 2009 г. в. | 14 838,05 |
| **2.** | Ford Transit VAN INDEEC 29459-04, рег. знак АМ 7363-7, 2012 г. в. | 12 054,05 |
| **3.** | Volkswagen Caddy PRACTIK 19277, рег. знак АР 9586-7, 2010 г. в. | 11 862,05 |
| **4.** | Volkswagen Caddy RYCAR 29454, рег. знак АС 0182-7, 2010 г. в. | 14 838,05 |
| **5.** | Volkswagen Caddy PRACTIK 19277, рег. знак АР 9578-7, 2010 г. в. | 11 862,05 |
| **6.** | Peugeot Boxer PRACTIK PR1620, рег. знак АК 7274-7, 2011 г. в. | 16 086,05 |
| **7.** | Volkswagen Caddy PRACTIK 19277-01, рег. знак АР 8153-7, 2014 г. в. | 14 550,05 |
| **8.** | Ford Transit INDEEC 29459, рег. знак АР 8188-7, 2012 г. в. | 15 702,05 |
| **9.** | Volkswagen Caddy PRACTIK 19277-01, рег. знак АР 8192-7, 2014 г. в. | 11 670,05 |
| **10.** | Ford Transit PRACTIK 29459, рег. знак АС 0155-7, 2012 г. в. | 15 702,05 |
| **11.** | Ford Transit INDEEC 29459, рег. знак АМ 2827-7, 2008 г. в. | 14 070,05 |
| **12.** | Ford Transit INDEEC 29459, рег. знак АР 8187-7, 2008 г. в. | 7 062,05 |
| **13.** | Volkswagen Caddy Maxi RYCAR-294544-03, рег. знак АК 2040-7, 2010 г. в. | 11 862,05 |
| **14.** | Volkswagen Caddy Maxi RYCAR-294544-03, рег. знак АР 8095-7, 2009 г. в. | 14 838,05 |
| **15.** | Ford Transit INDEEC 29459 01, рег. знак АМ 2349-7, 2010 г. в. | 15 990,05 |
| **16.** | Volkswagen Caddy RYCAR-294514-03, рег. знак АР 8249-7, 2010 г. в. | 14 838,05 |
| **17.** | Ford Transit 350 MWB INDEEC 29459, рег. знак АК 3127-7, 2010 г. в. | 19 062,05 |
| **18.** | Volkswagen Caddy PRACTIK 19277, рег. знак АР 9591-7, 2010 г. в. | 11 862,05 |
| **19.** | Volkswagen Caddy Maxi PRACTIK, рег. знак АР 8144-7, 2010 г. в. | 11 862,05 |
| **20.** | Peugeot Boxer PRACTIK PR1620, рег. знак АК 7276-7, 2011 г. в. | 16 086,05 |
| **21.** | Ford Transit VAN INDEEC 29459-04, рег. знак АР 8179-7, 2012 г. в. | 15 702,05 |
| **22.** | Volkswagen Caddy PRACTIK 19277-01, рег. знак АР 8154-7, 2014 г. в. | 14 550,05 |
| **23.** | Ford Transit VAN INDEEC 29459-04, рег. знак АК 3221-7, 2010 г. в. | 8 406,05 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN); БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов:** в течение **30 календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену.

Победитель электронных торгов, либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **10 %** от цены продажи лотов № 12 и № 23, **8 %** от цены продажи остальных лотов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов.

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 06.09.2025

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до момента определения победителя торгов, без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 20.10.2025 с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 17.10.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу **www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35.**
**E-mail: auction@cpo.by**

# ЛЯЧЭННЕ ЛЁГКІХ — ПРАЗ ПАВЕТРА ШАХТЫ

**Спусціліся ў бальніцу, якая знаходзіцца на глыбіні 420 метраў пад зямлёй**

Дзяржаўная ўстанова «Рэспубліканская бальніца спелеалячэння» ў горадзе Салігорску — гэта ўнікальная медыцынская ўстанова, якая выкарыстоўвае немедыкаментозны метад лячэння ў натуральным падземным спелеакомплексе, размешчаным у калійных рудніках на глыбіні 420 метраў. Бальніца з'яўляецца адзінай у свеце дзеючай установай такога профілю, якая практыкуе лячэнне ў падземных умовах. Для таго каб даведацца, як арганізаваны працэс лячэння ў падземным спелеакомплексе, мы пабывалі ў Салігорску і спусціліся ў шахту

## СТАБІЛЬНЫ МІКРАКЛІМАТ І ПАСТАЯННАЯ ТЭМПЕРАТУРА

«У чым жа асаблівасць лячэння ў гэтай медыцынскай установе?» — пытаюся ў **Наталлі ДУБОВІК, загадчыцы пульманалагічнага аддзялення бальніцы.**

«Асяроддзе ў шахце аказвае комплекснае ўздзеянне на арганізм чалавека дзякуючы таму, што тут фарміруецца стабільны мікраклімат з пастаяннымі тэмпературай паветра, вільготнасцю. Паветра насычана саляным аэразолем, які пранікае глыбока ў дыхальныя шляхі, лёгкімі адмоўна зараджанымі іонамі. Тут практычна адсутнічаюць мікробы, алергены», — расказвае Наталля Мікалаеўна.

Лячэбны эфект дасягаецца таксама і дзякуючы незвычайным умовам месцазнаходжання чалавека — пад зямлёй. Пацыент абаронены ад агрэсіўнага ўздзеяння навакольнага асяроддзя. Ствараецца экраніруючы эфект горнага масіву, што вельмі важна пры сучасным нестабільным экалагічным становішчы. Акрамя таго, на чалавека аказваецца пэўнае псіхалагічнае ўздзеянне.

«У нашых пацыентаў ёсць магчымасць шмат рухацца, займацца дазіраванай хадзьбой. Яны могуць ацаніць стан свайго арганізма да і пасля праходжання спелеалячэння, — гаворыць урач. — Лячэбны эфект знаходжання ў шахце дазваляе знізіць лекавую нагрузку. Гэта не значыць, што чыстае паветра замяняе лекавыя прэпараты. Яно выкарыстоўваецца як дадатак да асноўнага лячэння. Аднак у будучым спелеалячэнне дазваляе зменшыць выкарыстанне лекаў для купіравання прыступаў удушша, колькасць выклікаў хуткай дапамогі і радзей звяртацца да ўрача».






Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Асноўная колькасць пацыентаў мае захворванні органаў дыхання, большасць з іх пакутуюць ад бранхіяльнай астмы, але ёсць і тыя, у каго хранічны бранхіт, а таксама алергікі.

Бальніца разлічана на 200 ложка-месцаў, большасць з іх — 130 — прадугледжана для лячэння пацыентаў за кошт бюджэтных сродкаў. Для бясплатнага праходжання лячэння пацыенты прыязджаюць сюды па накіраваннях з усіх абласцей краіны.

## ХАТНЯЯ ЎТУЛЬНАСЦЬ І СТЭРЫЛЬНАСЦЬ

Праходзім па ўтульных аддзяленнях бальніцы. Прызнаюся, што спачатку нават цяжка было паверыць, што мы знаходзімся ў шахце. Высокія сцены, якія пераходзяць у арачнае перакрыццё, маюць прыемны ружовы колер, паколькі тут знаходзяцца запасы сільвініту — асадкавай горнай пароды. Уздоўж сцен размешчаны вазоны з кветкамі. Хатняя ўтульнасць створана і ў палатах, кожная з якіх разлічана на чацвёра чалавек. Двое пацыентаў тут знаходзяцца ўдзень і двое — у начны час. У кожнай палаце ажыццяўляецца адпаведная падача паветра. Яно праходзіць праз некалькі этапаў апрацоўкі працягласцю 2,5 кіламетра, глыбока ачышчаецца. Адзін раз у год ва ўстанове ажыццяўляецца замена солі.

Праходзім уздоўж більярдных залаў, месцаў для спартыўных гульняў. Футбольнае поле, баскетбольная карзіна, тэнісная сетка — кожны тут зможа выдатна правесці час.

«Паколькі падчас руху задзейнічаны ўсе групы мышцаў, і дыхальныя ў тым ліку, мы рэкамендуем нашым пацыентам хадзіць не менш паўгадзіны у дзень. Яны ахвотна выконваюць нашы рэкамендацыі. Многія ацэньваюць стан свайго арганізма да і пасля праходжання пэўнай адлегласці», — адзначае Наталля Дубовік.

## «УСЁ ЗАСТАЛОСЯ Ў ПРЫЕМНЫХ УСПАМІНАХ...»

Вельмі цікава было даведацца пра ўражанні аднаго з **пацыентаў Рэспубліканскай бальніцы спелеалячэння Уладзіміра ШУШКЕВІЧА,** жыхара г. Лепеля Віцебскай вобласці:

«Лячэнне ў гэтай бальніцы я праходзіў тры гады запар. Кожны год прыязджаў сюды ў перыяд з другой паловы кастрычніка да першай паловы лістапада. Ад знаходжання ў бальніцы атрымліваў сапраўднае задавальненне. Адна частка пацыентаў спускалася ў шахту ў начны час, а другая — днём. Пацыенты, якія знаходзіліся ў бальніцы ноччу, затым праходзілі дзённыя працэдуры. Цудоўная прырода, спуск у шахту — усё засталося ў прыемных успамінах. Дарэчы, эфект ад праходжання лячэння ў Рэспубліканскай бальніцы спелеалячэння быў відавочны. У мяне астма, але ніводнага прыступу пасля аздараўлення ў мяне не было».

Прайшоўшы па калідорах бальніцы, мы з калегам адчулі прыемную свежасць паветра. На працягу некалькіх гадзін, праведзеных на глыбіні шахты, мы сапраўды атрымалі прыліў энергіі і новых сіл.

**Святлана СІЛЬВАНОВІЧ.**

# ПАДАРУНАК ДЛЯ ЮНЫХ ДАСЛЕДЧЫКАЎ

**РУП «Белкартаграфія» запрашае ў свет ведаў і адкрыццяў**

Больш за 10 гадоў рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Белкартаграфія» распрацоўвае дзіцячую картаграфічную прадукцыю. Гэта не толькі дапаможнікі, якія адпавядаюць вучэбным праграмам па геаграфіі, гісторыі і астраноміі.

Яркія карты і атласы дапамагаюць юным даследчыкам больш даведацца пра сваю краіну, убачыць цікавы і захапляльны свет, пашырыць кругагляд, а камусьці — нават перамагчы ў алімпіядах. Бацькі і педагогі могуць падабраць такія візуальныя дапаможнікі, якія задаволяць розныя запыты дапытлівых дзетак. Малыя могуць знаёміцца з краінамі і сцягамі, раслінамі і жывёламі, аўтамабілямі і нават навагоднімі чараўнікамі краін свету. Між іншым, апошняя «чароўная» карта асабліва запатрабавана перад навагоднім святам. Наогул, дзіцячыя атласы і карты ад «Белкартаграфіі» — гэта адзін з самых папулярных падарункаў для юных вундэркіндаў. Побач з прыгожымі малюнкамі і цікавымі фактамі ў іх можна знайсці загадкі, красворды, наклейкі. Пры дапамозе QR-кодаў дзеці атрымліваюць дадатковую інфармацыю, а спецыяльны мабільны дадатак дазваляе «ажывіць» некаторыя малюнкі. Дарэчы, з 3D-эфектам «Белкартаграфія» сёння робіць не толькі папяровую прадукцыю, але і драўляную — карту-пазл «Жывёльны і раслінны свет Беларусі».




РУП «Белкартаграфія» прапаноўвае шырокі асартымент дзіцячай прадукцыі.

## КУТОК МАЛЕНЬКАГА ПРАФЕСАРА

Сёння ў навучальных установах вядзецца вялікая работа для таго, каб навучыць дзяцей бавіць час без гаджэтаў. Афармляюцца тэматычныя куткі, на паліцах расстаўляецца літаратура, якая можа зацікавіць юных адкрывальнікаў. Атласы і карты «Белкартаграфіі» дапамогуць не толькі заняць дзяцей, але і замацаваць веды, атрымання на занятках, адкрыць новыя факты. Адзін з такіх папулярных дапаможнікаў — атлас «Мая Беларусь». У ім сабрана калекцыя карт, якая знаёміць з гісторыяй, культурай, рамёствамі, строямі, помнікамі архітэктуры, памятнымі мясцінамі, звязанымі з Вялікай Айчыннай вайной, жывёльным і раслінным светам, геральдыкай, прамысловасцю і сельскай гаспадаркай нашай краіны. Прычым гэты атлас сёння выпускаецца ў двух фарматах: вялікім і малым.

Наогул, прадукцыя «Белкартаграфіі» актыўна выкарыстоўваецца ў вучэбным працэсе. Сёлета пабачыў свет абноўлены, з улікам праграмы 3 класа, атлас «Чалавек і свет». Дзякуючы яркім малюнкам і фатаграфіям, якія дапаўняюць карты і тэкст, дзеці з задавальненнем засвойваюць новы матэрыял.

— Карты — гэта мова геаграфіі і гісторыі, — заўважае **галоўны рэдактар РУП «Белкартаграфія» Галіна ЛЯХАВА.** — Без іх цяжка зразумець падзеі, працэсы, з'явы.

Перавага атласаў і карт яшчэ і ў тым, што ў іх можна падаць «паўлічаную карцінку», візуалізаваць тэкст падручніка, даць дадатковую інфармацыю, што асабліва важна, калі падручнікі не павінны расці ў вазе.



Прадавец-кансультант Святлана КАШАЛАПАВА дэманструе пазлы ў фірмовай краме.

Для самых маленькіх даследчыкаў новыя атласы і карты ствараюцца з гульнявымі элементамі. Напрыклад, атлас «Раслінны і жывёльны свет Беларусі» зроблены як расфарбоўка.

## ЧАРОЎНЫЯ ВАНДРОЎКІ

Сёння «Белкартаграфія» дазваляе дзецям падарожнічаць па свеце. З дапамогай карт і атласаў можна даведацца, дзе і калі былі зроблены вялікія адкрыцці, адкуль родам расліны і жывёлы. Сярод навінак — карта-расфарбоўка «Краіны і строі народаў свету». Шыкоўны падарунак для вундэркіндаў — атлас «Цуды прыроды. Запаведнікі і нацыянальныя паркі свету». Дзеці, якім ён трапіць у рукі, пабываюць у маляўнічых кутках свету, дзякуючы сучасным тэхналогіям змогуць убачыць 3D-панарамы, відэа, а яшчэ выканаюць творчыя заданні.

Шмат створана розных дапаможнікаў, прысвечаных Беларусі, у тым ліку і асобным яе рэгіёнам (серыя атласаў «Гарады Беларусі»). Таксама «Белкартаграфія» працуе над інтэрактыўнымі рэсурсамі. Дзякуючы карце «Мая Радзіма — Беларусь» можна ўбачыць, а дзякуючы аўдыягіду — і пачуць шмат цікавай інфармацыі пра традыцыі, архітэктуру, культурныя здабыткі нашай краіны. Інтэрактыўная карта «Адкрый Мінск» дазволіць не проста падрыхтавацца да экскурсіі па сталіцы, але і «пабываць» на некаторых аб'ектах.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
**Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

УНП 190024351

# ПЕРАПЛЯЦЕННЕ ЛЁСАЎ СТВАРАЕ ЖЫЦЦЁ

## Дзе адшукаць святло ў цёмныя часы?


У ліку пераможцаў фестывалю — Ганна Літаш.

**Менавіта на такіх думках часцей за ўсё лавіла сябе падчас IX Фестывалю дакументальнага кіно краін СНД «Еўразія.DOC», паказы якога 2 і 3 кастрычніка прайшлі ў беларускай сталіцы. Цяпер, калі падведзены вынікі (сярод пераможцаў сёлета нямала беларусаў), хочацца сабраць усё ў адну палітру.**

Вынікі ў цэлым адлюстравалі якраз тыя акцэнты, якімі быў адметны сёлетні кінафорум. Нагадаем, сярод тэм ключавымі сталі 80-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, нацызм у XXI стагоддзі, тэма малой радзімы, інтэграцыйныя працэсы на Еўразійскай прасторы, а галоўнае — чалавек і яго лёс у кантэксце часу. Так, Гран-пры кінафоруму журы прысудзіла фільму Уладзіміра Сумашэдава «Вораг нумар тры» (Расія). Сам рэжысёр адзначыў на ўручэнні: «Гэта фільм пра тое, як з дапамогай прыгажосці, мастацтва ў самыя цёмныя часы адшукаць святло і зберагчы ў сабе чалавека. Ён пра тое, што мастацтва можа выратоўваць людскія жыцці, і пра чалавека, які з дапамогай свайго фотамантажу захаваў і адстаяў гонар Радзімы».


Кадр з кінастужкі «Тыя, хто выжыў».

У ліку пераможцаў «Еўразія.DOC» і беларускія кінастужкі «Тыя, хто выжыў» Ганны Літаш і «Птушка фенікс Аляксея Талая» Уладзіміра Луцкага, а таксама «Ягноб» таджыкскага рэжысёра Пайрава Шырыфава.

Кожная з іх — аўтарскі расповед пра гераізм чалавека пры любых абставінах. І няхай для адных ён у тым, каб захаваць сябе ў нечалавечых умовах, а для другіх — у імкненні захоўваць свае традыцыі і культуру ў віры зменлівага навакольнага свету.

Традыцыйна кінафорум даў гледачам і гасцям магчымасць паглядзець і абмеркаваць самыя розныя тэмы і бачанне іх кінатворцамі сучаснасці. Спецыяльных прызоў сёлета ўдастоілі такія кінаработы, як «Соль зямлі рускай» Аляксандра Матросава (прыз уладыкі Веніяміна, Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі), «Ваенкары» Аляксандра Прахарэнкава (прыз Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь). А вось Прыз сімпатый гледачоў дастаўся фільму «Чэлендж: вярбоўка» Аляксандра Кулікова.



Фестываль некамерцыйны, а значыць, трапіць на яго паказы могуць усе ахвотныя. Што і можна заўсёды назіраць. Аднак ёсць адзін момант: калі на паказы прыходзіць шмат школьнікаў, то, на жаль, не заўсёды кожны з маладых людзей зацікаўлены ў тым, каб засяроджвацца на гісторыі, аналізаваць жыццё і герояў у адлюстраванай на экране гісторыі. І тут нават не ведаеш, у чым насамрэч праблема: ці фільм ім не цікавы, ці проста паказваюць яго ў неспрыяльны час?


Кадр з фільма «Ягноб».

Дарэчы, калі казаць пра маладых, то тыя, хто спрабуе сябе ў дакументальным кіно, на фестывалі маюць магчымасць быць заўважанымі ў рамках маладзёжнага конкурсу «Еўразія DOC: 4 хвіліны». Тройку найлепшых у гэтым годзе склалі творчая група Алены Такій і Сяргея Назарэнкава з кінастужкай «Восемдзесят» (Расія), Аліна Бабарыкава з кінаработай «Вярнуцца да цябе» (Беларусь) і творчая група з Кітая Хаа Цюнь, Чжан Хайянь, Сюй Цзян Юэ з фільмам «Добрасардэчныя захавальнікі цукровага мастацтва».

— Фестываль «Еўразія.DOC» шчыльна злучаны з рэальным жыццём. Ён пра жыццё і пра нас у ім. Што не выключае лірычнасці, сузірання, часам і нейкай адхіленасці ў работах удзельнікаў. Пры гэтым заўсёды ў праграме фестывалю прысутнічае баланс паміж асабістым і грамадска значным, камерным і маштабным, актуальным сучасным і актуальным гістарычным. І нельга не адзначыць выбудаваны ў праекце баланс паміж дакументальным тэлевізійным кіно і аўтарскім, — сказаў у інтэрв'ю **дырэктар IX Фестывалю дакументальнага кіно краін СНД «Еўразія.DOC» Валерый ШАХАЎЦОЎ.** — Самае галоўнае, што наш праект склаўся ў сваёй самабытнасці і стаў часткай аб'ектыўнай рэальнасці. Культурнай, грамадскай, творчай.

Падзяляе гэты пасыл і **старшыня Беларускага саюза журналістаў, выканаўчы прадзюсар фестывалю Андрэй КРЫВАШЭЕЎ,** які акцэнтаваў увагу на тым, што «Еўразія.DOC» — не толькі конкурсная пляцоўка для кінадакументалістаў, але і прастора для такое кіно: «Я вельмі ўдзячны стваральнікам фільмаў, аўтарам і ўсім, хто наведваў нашы мерапрыемствы. Мы шчыра абмяркоўвалі самыя сур'ёзныя тэмы. Спадзяюся, што і на наступным фестывалі зможам убачыць яшчэ больш фільмаў, цікавых тэм і герояў».

**Алена ДРАПКО.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

## ОАО «Н Холдинг» проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности ОАО «МПОВТ»

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ № 1** | Капитальное строение с инв. № 600/С-182232, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/18, вблизи аг. Колодищи. Площадь: 22,7 кв. м. Наименование: Диспетчерская (114-й цех) (инв. № 32955). Назначение: Здание специализированное иного назначения. Составные части и принадлежности: 18А1/к-Диспетчерская (114-й цех) (инв. № 32955).<br>Капитальное строение с инв. № 600/С-182223, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/17, вблизи аг. Колодищи. Площадь: 792,7 кв. м. Наименование: Склад (инв. № 28936). Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: 17А1/к-Склад (инв. № 28936), 1-Пристройка, 2-Пристройка, 3-Пристройка. Обременение: аренда.<br>Капитальное строение с инв. № 600/С-182239, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/19, вблизи аг. Колодищи. Площадь: 420,4 кв. м. Наименование: Механизированный склад кубовых отходов МПП-33100 (инв. № 41114). Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: 19А1/м-Механизированный склад кубовых отходов МПП-31100 (инв. № 41114). Обременение: аренда.<br>Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 623683400001000692 площадью 9,7659 га, предоставленном ОАО «МПОВТ» на праве постоянного пользования (срок действия: не установлен).<br>На земельном участке установлены следующие ограничения (обременения): зона санитарной охраны источников артскважина № 32265/78, площадь 9,7659 га | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **876 000,00** | **Задаток, BYN** | **87 600,00** | **Шаг аукциона** | **5 %** |
| **ЛОТ № 2** | Капитальное строение с инв. № 600/С-151680, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/4, район аг. Колодищи. Площадь: 20,6 кв. м. Наименование: Склад. Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: Одноэтажное кирпичное здание склада.<br>Капитальное строение с инв. № 600/С-149363, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/1, район аг. Колодищи. Площадь: 696,7 кв. м. Наименование: Механизированный склад. Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: Одноэтажное металлическое здание механизированного склада. Обременение: аренда.<br>Капитальное строение с инв. № 600/С-182224, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/29, вблизи аг. Колодищи. Площадь: 68,3 кв. м. Наименование: Помещение для мотопомпы (инв. № 29755). Назначение: Здание специализированное иного назначения. Составные части и принадлежности: 29А1/б-Помещение для мотопомпы (инв. № 29755). Обременение: аренда.<br>Капитальное строение с инв. № 600/С-159129, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/8, район аг. Колодищи. Площадь: 373,0 кв. м. Наименование: Склад АТ-10077 (инв. № 952702). Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: Одноэтажное металлическое здание склада АТ-10077 (инв. № 952702) А1/м. Обременение: аренда.<br>Капитальное строение с инв. № 600/С-159126, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/7, район аг. Колодищи. Площадь: 485,9. Наименование: Склад НПР-2552 (инв. № 48699). Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: Одноэтажное металлическое здание склада НПР-2552 (инв. № 48699) А1/м. Обременение: аренда.<br>Капитальное строение с инв. № 600/С-182220, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/28, вблизи аг. Колодищи. Площадь: 265,2 кв. м. Наименование: Механизированный склад АТ-4086 (инв. № 14395). Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: 28А1/к-Механизированный склад АТ-4086 (инв. № 14395). Обременение: аренда.<br>Капитальное строение с инв. № 600/С-171273, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/9, район аг. Колодищи. Площадь: 2,8 кв. м. Наименование: Туалет на 2 очка № 1. Назначение: Здание специализированное коммунального хозяйства. Составные части и принадлежности: Одноэтажный кирпичный туалет на 2 очка № 1 (литер 1А1/к).<br>Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 623683400001000692 площадью 9,7659 га, предоставленном ОАО «МПОВТ» на праве постоянного пользования (срок действия: не установлен).<br>На земельном участке установлены следующие ограничения (обременения): зона санитарной охраны источников артскважина № 32265/78, площадь 9,7659 га | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **1 364 436,36** | **Задаток, BYN** | **136 443,64** | **Шаг аукциона** | **5 %** |

| | |
|---|---|
| **Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «МПОВТ», Республика Беларусь, 220140, г. Минск, ул. Притыцкого, д. 62. Тел. +375 (17) 388 90 99. E-mail: mpovt@mpovt.by |
| **Сведения об организаторе аукциона** | ОАО «Н Холдинг», 220029, г. Минск, пр-т Машерова, 11, пом. 1. Тел. 8 029 754 63 46 (Мария) |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 5 (пяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона, а также в течение 3 (трех) рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона выплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 3 % от цены продажи предмета аукциона на основании счета, выставленного организатором аукциона |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (нерезидентами – в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) не позднее дня подачи заявления на участие в аукционе на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр-т Независимости, 56. Получатель – Открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240, ОКПО 37392696.<br>Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты объекта, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 16 октября 2025 включительно** в рабочие дни с 9.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1 |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Аукцион состоится **17 октября 2025 года** по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг»: по Лоту № 1 в 11.00; по Лоту № 2 в 15.00 |

Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от проведения аукциона

СПОРТ-ТАЙМ

# ЯКАЯ «ЦАНА МЕДАЛЯ»?

## Ацэньвалі на найбуйнейшым у СНД адукацыйным семінары, які прайшоў у Мінску

Вучыцца ніколі не позна, нават тым прафесіяналам, якія вучаць іншых. Таму Беларуская федэрацыя лёгкай атлетыкі сумесна з Прэзідэнцкім спартыўным клубам і ў супрацоўніцтве з Асацыяцыяй трэнераў па лёгкай атлетыцы арганізавалі найбуйнейшы ў СНД семінар для трэнераў па лёгкай атлетыцы «Цана медаля». Семінар сабраў сотні спецыялістаў з усёй краіны і стаў для іх магчымасцю павысіць свае кампетэнцыі, абмеркаваць актуальныя пытанні, абмяняцца досведам з калегамі.

«Развіццё айчыннага спорту залежыць ад прафесіяналізму трэнерскага складу і сумеснай працы ўсіх зацікаўленых. Абмен вопытам — важкі ўклад у агульную справу. Нам трэба больш падобных мерапрыемстваў, больш магчымасцяў для абмену вопытам і, вядома, больш міжнародных спікераў. Я з вялікім задавальненнем звярнулася да ўдзельнікаў семінара і падзякавала кожнаму за іх нялёгкую працу і за імкненне да ведаў! Менавіта моцная каманда, якая працуе на вынік, памножаная на працавітасць і спартыўную дысцыпліну, дае той самы жаданы вынік», — падкрэсліла **член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў, майстар спорту міжнароднага класа па лёгкай атлетыцы Анастасія МІРОНЧЫК-ІВАНОВА.**





У праграме семінара «Цана медаля» — пазнавальныя лекцыі, практычныя парады, майстар-класы, падчас якіх удзельнікі маглі праверыць на сабе ўсе заданні і практыкаванні. Кола тэм надзвычай разнастайнае: спрынт, вынослівасць, скачкі, кіданні. Трэнеры абмеркавалі пачатковы этап падрыхтоўкі спартсменаў, псіхаэмацыянальны складнік, праблемы ўжывання допінгу.

На семінары выступіла Рэната Канова — адзін з найлепшых сусветных трэнераў у бегу на вынослівасць. Пра нюансы кіданняў слухачам расказваў Дон Бэбіт — лектар сусветнай лёгкаатлетычнай асацыяцыі ўзроўню V на курсах Акадэміі кіданняў. З тонкасцямі трайнога скачка (які лічыцца самым складаным сярод скачкоў) знаёміў Крысціян Тэйлар — двухразовы алімпійскі чэмпіён у трайным скачку, чатырохразовы чэмпіён свету.

Сярод удзельнікаў не толькі дасведчаныя трэнеры, але і будучыя спецыялісты — студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры. Для іх гэта таксама вучоба, але ў новым, больш арыгінальным, а таму больш запамінальным, фармаце. Галоўнае — потым выкарыстаць атрыманыя веды на практыцы.

Дарэчы, «цану медаля» падчас семінара шукалі не толькі трэнеры па лёгкай атлетыцы, але і па іншых відах спорту. Нічога дзіўнага — лёгкая атлетыка ляжыць у аснове агульнафізічнай падрыхтоўкі, якая неабходна ўсім іншым відам. Нездарма ж яна лічыцца «каралевай спорту».

**Уладзімір Кашэўскі — трэнер футбольнай акадэміі «Сталіца-Юні» адзначыў:** «Асабліва цікавымі асабіста для мяне сталі тэма самарэгуляцыі, псіхалагічнай падрыхтоўкі спартсменаў. Вельмі рады, што ўбачыў практычныя аспекты падрыхтоўкі спартсменаў, прыняў іх на ўзбраенне, буду прымяняць у сваёй дзейнасці».

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі.**

НАДВОР'Е

# ДАЖДЖЫ І ТУМАНЫ

## Уначы без замаразкаў

У першай палове кастрычніка ўсе мы з нецярпеннем чакаем бабінага лета. У пачатку гэтага тыдня да нас прыйшла яго «рэпетыцыя», паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.



Ужо сёння надвор'е ў Беларусі будзе вызначаць цёплая вільготная паветраная маса. Ноччу без істотных ападкаў, раніцай і днём месцамі па краіне пройдуць невялікія дажджы. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах чакаецца туман. Вецер няўстойлівы слабы. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад 2 да 8 °С, удзень — ад 11 да 17 °С.

У сераду месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Вецер няўстойлівы ад слабага да ўмеранага. Тэмпература паветра ноччу складзе 1—7 °С, па ўсходзе Беларусі — да 9 °С з плюсам. Днём будзе 10—16 °С.

І ў чацвер месцамі чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Вецер няўстойлівы ад слабага да ўмеранага. Тэмпература паветра ўначы — ад 2 °С да 9 °С, а днём — 9—15 °С.

**Сяргей КУРКАЧ.**






Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
*(Организатор аукциона)*
по поручению **ОАО «Тимирязевский»** *(Продавец)*
проводит открытый аукцион по продаже:

**Лот 1: здание зерносклада с инвентарным номером 642/С-42441, общ. пл. 716,3 кв. м**
**(составные части и принадлежности: пристройка, навес), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 622881700001000076 (право аренды по 15.05.2055) площадью 1,2757 га, по адресу: Минская обл., Копыльский р-н, Бучатинский с/с, 40, вблизи д. Смоличи.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **47 880,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **4 788,00** бел. руб.

**Лот 2: здание картофелехранилища с инвентарным номером 642/С-42442, общ. пл. 861,0 кв. м,**
**расположенное на земельном участке с кадастровым номером 622880400001000179 (право аренды по 15.05.2055) площадью 0,3112 га, по адресу: Минская обл., Копыльский р-н, Блевчицкий с/с, 22, вблизи д. Блевчицы.**
Земельный участок имеет ограничения прав в использовании: охранная зона электрических сетей (0,0124 га).

Начальная цена с НДС (20 %) – **65 040,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **6 504,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает затраты на публикацию извещения о проведении аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **10.11.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **05.11.2025** до **17.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-64, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: (801719) 2-44-83, (8033) 335-21-98.**

УНП 600018425

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях КАСЦЕВІЧ Ірыне Анатольеўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.
АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы
тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 12 351. Індэкс 63850. Зак. № 2198.

Нумар падпісаны ў 19.30 6 кастрычніка 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12